ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛЮТЫ 8 1933 г. № 30 (4574)

Год выданьня XVI

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Да IV сэсіі ЦВК БССР. М. САКАЛОЎСКІ — Аб трактарнай майстэрні і «спартсэзнах» (2 стар.).

Карэспандэнцыя: Б. ПАПОЎ, С. ГАЛКІН — Пераможныя гімны» аршанскага райза і сапраўджасьць (2 стар.).

Ільнаводчыя раёны аслабілі тэмпы ільназагатовак (1 стар.).

100 проц. ссыпкай насеньня, свячасовым рамонтам трактараў і машын, падрыхтоўкай жывой і цягавай сілы забясьпечым выкананьне пасоўных плянаў (2 стар.).

МНОЖЦЕ РАДЫ ПЕРАДАВЫ КАЛГАСАЎ! — Адкрыты ліст другой Барысаўскай раённай агранамічна-заатэхнічнай канфэрэнцыі (1 стар.).

Павысіць клясавую пільнасьць на лесазагатоўчым фронце (3 стар.).

Рабочыя Менску рыхтуюць баявую сустрэчу Усесаюзнаму зьезду калгаснікаў-ударнікаў (3 стар.).

Дэкадзік Беларускай Акадэміі Навук у Маскве (4 стар.).

Канчатковая ліквідацыя дапамогбеспрацоўным у Польшчы (4 стар.).

«Камісія 19-ці» адхіліла японскую прапанову.

Вымірачыя гарады Германіі.

ДА IV СЭСІІ ЦВК БССР

Сэсія ЦВК БССР зьбіраецца на важнейшым гістарычным этапе, у момант, калі рабочая кляса, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК на чале з тав. СТАЛІНЫМ, з посьпехам выканала пяцігодку за чатыры гады, адразу за гістарычным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) і III сэсіяй ЦВК СССР, якія падвялі вынікі першай пяцігодкі і з бальшавіцкай выразнасьцю намецілі задачы на першы год другой пяцігодкі.

IV сэсія ЦВК БССР склікаецца ў той час, калі Савецкі саюз стаў краінай буйнай машыннай індустрыі, калі створана ўпасная база тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, пабудаваны буйнейшыя гіганты чорнай і каляровай металюргіі, энэргетыкі і хэміі. За гады пяцігодкі асвоены такія складаныя віды вытворчасьці, як аўтабудаўніцтва, авіябудаўніцтва, радыёўстаноўкі, выраб штучнага валакна, пластычных мас і г. д.

У выніку першай пяцігодкі Савецкі саюз з краіны дробна-сялянскай пераўтварыўся ў краіну самага буйнага зямляробства. Пад сельскую гаспадарку падведзена магутная тэхнічная база 2.500 МТС працуюць на палёх Савецкага саюзу. Мы ня толькі скончылі ў асноўным калектывізацыю, мы дабіліся таго, што ў разуменьні вялізарнай колькасьці сялянства калгасы сталі найбольш ужытнай формай гаспадаркі. Гэта — вялізарная перамога, таварышы. Цяпер пытаньне стаіць ужо не аб тым — быць ці ня быць калгасам, — гэтае пытаньне ўжо вырашана станоўча. Калгасы замацаваны, і шлях да старой аднаасобнай гаспадаркі закрыт канчаткова» (СТАЛІН).

Ва ўмовах БССР наладжана вытворчасьць машынабудаўніцтва (бульбакапалкі, торфмашыны, новыя варштаты мэтальапрацоўкі і г. д.), новых будматар'ялаў, механічная і частковая хэмічная апрацоўка торфу, удасканалена апрацоўка драўніны, маргарынавая прамысловасьць і інш.

Дасягнуты вялізарныя посьпехі ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

На аснове буйнага росту эканомікі краіны дасягнуты буйнейшыя посьпехі на культурным фронце. БССР ліквідавала, дзякуючы правільнаму правядзеньню ленінскай нацыянальнай палітыкі, спадчыну царызму — бескультур'е і цёмру. Савецкая Беларусь абвешчана краінай суцэльнай пісьменнасьці.

Вось з якімі вынікамі падыходзіць БССР да чацьвертай сэсіі.

Народна-гаспадарчы плян на 1933 год, весняная пасеўная кампанія і ўздым ураджайнасьці, дзяржаўны бюджэт, масавая работа саветаў — галоўныя пытаньні, якія будзе разглядаць і вырашаць IV сэсія ЦВК БССР.

«У пэрыяд першай пяцігодкі мы здолелі арганізаваць энтузіязм, пафас новага будаўніцтва і дабіліся рашаючых посьпехаў. Гэта вельмі добра. Але цяпер гэту справу мы павінны далоўніць энтузіязмам, пафасам асваеньня новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным уздымам прадукцыйнасьці працы, сур'ёзным скарачэньнем сабекошту. У ГЭТЫМ ЦЯПЕР ГАЛОЎНАЕ» (СТАЛІН).

У гэтых словах правадыра нашай партыі і сусьветнага пралетарыяту адлюстравана асноўная праграма практычнай дзейнасьці ў галіне прамысловасьці на другую пяцігодку. Каб ажыцьцявіць гэту праграму, сэсія павінна будзе наметіць канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на вырашэньне задач, што стаяць перад прамысловасьцю БССР на 1933 год.

Сэсія ЦВК павінна будзе вызначыць тыя канкрэтныя мерапрыемствы, якія забясьпечаць пасьпяховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі, пасьпяховую барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці.

Кулацкія элементы, агентура кулака робяць усе захады, каб сарваць выкананьне чарговых палітычна-гаспадарчых задач, каб разбурыць калгасы з сярэдзіны. Гэта асабліва выявілася пры правядзеньні загатовак. Формы клясавай барацьбы зараз зьмяніліся. Клясавы вораг адкрыта цяпер не выступае, ён «ціхай сапай» імкнецца падарваць калгаснае будаўніцтва і разбурыць калгасы.

Вось чаму сэсія павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на задачы арганізацыйна - гаспадарчага і палітычнага ўмацаваньня калгасаў. А гэта ня можа быць вырашана без забясьпячэньня бальшавіцкага вока і кантролю за ўсіх галінах работы, без разгортваньня шырокай масавай палітычна - выхаваўчай работы, без арганізацыі ў саўгасах і калгасах сапраўднага партыйнага і савецкага актыву, без заваяваньня большасьці мас калгасьнікаў, без выманьня антысавецкіх элементаў, якія прабраліся ў калгасы, без уменьня прыстасоўваць усе сродкі і магутнасьць пралетарскай дыктатуры, каб дашчэнту дабіць кулака і яго агентуру.

Сэсія павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на барацьбу за працоўную дысцыпліну ў калгасах, супроць дэзэртаці батараў калгаснай вытворчасьці.

«Асаблівая вялікую ўвагу зьвярнуць на разьбіцьцё і замацаваньне таварыскай дысцыпліны працоўных і ўсебаковае павышэньне іх самадзейнасьці і ўсьведамленьня адказнасьці. У гэтым заключаецца галоўнейшы, калі не адзіны, сродак канчатковае перамогі капіталізм і звычаі, створаныя панаваньнем прыватнай уласнасьці і на сродкі вытворчасьці» (ЛЕНІН, т. XXIV, ст. 101).

Якраз тэму III сэсія ЦВК СССР і далоўніла прыкладны статут арцелі ў наступнай рэдакцыі.

«У выпадку адмаўленьня члена калгасу па наўважлівых прычынах од выкананьня даручанай яму калгаснай работы, праўленьне калгасу абавязана аштрафаваць яго ў колькасьці да 5-ці працадзён, а пры паўторным адмаўленьні — выключыць яго з калгасу».

Стварэньне палітаддзелаў МТС, узмацненьне іх проверанымі бальшавіцкімі кадрамі, сканцэнтраваньне ўвагі ўсіх нашых арганізацый на пытаньнях вёскі, на пытаньнях арганізацыйнага, гаспадарчага і палітычнага ўзмацненьня калгасаў—зьявіцца асновай новых перамог нашай партыі ў барацьбе за максымальнае павышэньне ўраджайнасьці, за завяршэньне сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

На сэсію выклікаюцца старшыні вяду чых сельсаветаў, старшыні калгасаў, калгасьніцы, дырэктары саўгасаў і МТС, рабочыя саўгасаў, трактарысты і інш. Усе яны разам з членамі ЦВК павінны прыняць актыўны ўдзел у практычным вырашэньні пытаньняў, зьвязаных з новымі задачамі работы на вёсцы, зьвязаных з пасьпяхсным правядзеньнем першай веснавой пасеўкампаніі другой пяцігодкі.

Дзяржбюджэт БССР прадугледжвае на 1933 год значнае скарачэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, каб вызваленыя сродкі пайшлі на далейшае разьвіцьцё нашай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, на далейшае сацыяльна-культурнае будаўніцтва і паляпшэньне матар'яльна-бытавога абслугоўваньня працоўных. Сэсія бязумоўна выявіць новыя магчымасьці як у галіне павялічэньня даходнай часткі бюджэту, так і ў галіне скарачэньня расходнай часткі.

Сэсія ЦВК павінна будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу на правядзеньне самай жорсткай эканоміі сродкаў, на рашучае змаганьне з непрадукцыйнымі выдаткамі, на рашучае скарачэньне адміністрацыйных выдаткаў, на самыя беражлівыя адносіны да дзяржаўных сродкаў, на ўсямерную барацьбу за зьніжэньне сабекошту, за павышэньне прадукцыйнасьці працы.

Сэсія ЦВК абмяркуе такія вельмі важныя пытаньні, як арганізаваная работа саветаў. Тав. Сталін у сваім дакладзе на апошнім абъядненым пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) указаў, што «моцная і магутная дыктатура пралетарыяту—вось што нам неабходна цяпер для таго, каб разьвеяць ушчэнт апошнія рэшткі выміраючых клясаў і разьбіць іх эпадзейскія махінацыі».

Адсюль ва ўвесь рост паўстае задача—усямерна ўзмацніць работу саветаў, очысьціць іх ад перарадзіцьцаў і клясава-варожых элемэнтаў. «Адміраньне дзяржавы прыдзе не праз аслабленьне дзяржаўнай улады, а праз яе максымальнае ўзмацненьне, неабходнае для таго, каб дабіць рэшткі паміраючых клясаў і арганізаваць абарону супроць капіталістычнага акружэньня, якое далёка яшчэ ня зьнішчана і ня хутка яшчэ будзе зьнішчана» (СТАЛІН).

Саветы, як праваднікі генэральнай лініі нашай партыі, адыгрываюць вялізарнейшую ролю ў хуткай і правільнай рэалізацыі пастановаў партыі, у іх праламленьні ў штодзённай практыцы сваёй работы і работы сэкцый і дэпутацкіх груп.

Рашучы паварот саветаў тварам да вытворчасьці, да калгаснага будаўніцтва яшчэ і яшчэ раз вымагае шырокага разгортваньня арганізацыйна - масавай работы саветаў. У агульнай сыстэме масавай работы саветаў буйнейшую ролю павінны адыграць сэкцыі і дэпутацкія групы. Дэпутацкія групы, зьяўляючыя ячэйкамі саветаў, павінны стаць арганізатарамі ўсёй савецкай работы на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах і МТС. Праз дэпутацкія групы саветы мабілізуюць рабочую і савецкую грамадзянасьць на выкананьне гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад імі, вядуць барацьбу за выкананьне прамфінпляну, за паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня працоўных і г. д. На ўзмацненьне работы масавых зьвеньняў саветаў і наступ усіх форм масавай работы саветаў сэсія павінна будзе зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Сэсія ЦВК таксама зацьвердзіць важнейшыя пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР, якія былі прыняты паміж III і IV сэсіямі. Галоўны кірунак заканадаўства, якое ўносіцца на зацьвярджэньне сэсіі—стварэньне неабходных умоў для забясьпячэньня посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва і зьнішчэньня ўсіх перашкод, што стаяць на шляху гэтага будаўніцтва. Ахова дзяржаўнай і грамадзкай маемасьці, барацьба з кулацтвам, сабатажнікамі гаспадарча-палітычных кампаній, шкоднікамі і г. д.

БССР мае ўсе неабходныя прадпасылкі для пасьпяховага вырашэньня задач, якія стаяць перад краінай у першым годзе другой пяцігодкі. Палітычная сьвядомасьць і актыўнасьць працоўнага насельніцтва надзвычай выраслa. Аб апошнім гаворыць тое, што сацыялістычныя мэтады працы моцна ўкараніліся ў работу як прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі.

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і яе ленінскага ЦК на чале з правадыром рабочае клясы т. СТАЛІНЫМ, у бязьлітасным змаганьні з клясавым ворагам, у змаганьні за няўхільнае і пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі, у змаганьні з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, «лявацкімі» перагібамі і контр-рэвалюцыйным трацкізмам, шляхам бязьлітаснага разгрому антыпартыйных груповак, рашучай барацьбы з шавінізмам і нацыяналізмам, шляхам рашучага выкрыцьця клясавых ворагаў з партбілетамі ў кішэні з ліку буржуазных перарадзінцаў, рабочая кляса БССР з посьпехам выканае пляны першага году другой пяцігодкі.

Абвастрэньне клясавай барацьбы, аслабіла ў пэрыяд загатовак выклікала актывізацыю рэшткаў буржуазных нацыяналістаў у Беларусі. Клясавы вораг, супраціўляючыся мерапрыемствам партыі, часта прыкрываецца фальшыва-нацыянальным сьцягам. Гэты новы, вельмі тонкі мэнэўр кулака і яго авангарду—нацыянал-дэмакратаў павінен атрымаць самы рашучы і жорсткі адпор.

Члены ЦВК БССР своім актыўным і практычным удзелам у рабоце сэсіі здолеюць забясьпечыць ня толькі канкрэтнасьць не пастанову, але і па-бальшавіцку будуць змагацца за няўхільнае правядзеньне іх у жыцьцё.

М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Да ўсесаюзнага зьезду ўдарнікаў-калгасьнікаў

Множце рады перадавых калгасаў!

РАЗГОРТВАНЬНЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПА ЛЕПШАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ПЕРШАЙ ВЯСНЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ, ПЕРАДАЧАЙ ВОПЫТУ ПЕРАДАВЫХ АДСТАЮЧЫМ СУСТРЭНЕМ ЗЬЕЗД УДАРНІКАЎ КАЛГАСНЫХ ПАЛЁЎ

Адкрыты ліст другой Барысаўскай раённай агранамічна-заатэхнічнай канфэрэнцыі старшынь калгасаў, брыгадзіраў і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі да ўсіх рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў і спэцыялістаў сельскай гаспадаркі БССР

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Студзеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) і 3 сэсія ЦВК СССР над вялі вынікі пераможнай барацьбы рабочай клясы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі па чале з улюбёным правадыром і настаўнікам сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным у справе пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і далі баявую праграму дзеяньняў на першы год другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

У выніку пяўхільнага правядзеньня палітыкі індустрыялізацыі і разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце, стварэньня магутнага савецкага сельгасмашынабудаўніцтва, барацьбы з клясава варожым элемэнтам, кулаком, пасьпяхова выкананая асноўная задача пяцігодкі — стварэньне ўлаўнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. З адсталай аграрнай, дробна-сялянскай краіны, якой была царская Расія, Савецкі саюз ператварыўся ў краіну індустрыяльную, перадавую, «краіну магутную ў сэнсе абароназдольнасьці, краіну гатовую да ўсякіх выпадковасьцей» (Сталін). СССР з краіны дробна-сялянскай ператварыўся ў краіну самага буйнага зямляробства. Кулацтва як кляса разгромлена. «Калгасы замацаваны і шлях да старой аднаасобнай гаспадаркі — закрыт канчаткова» (Сталін).

Рабочыя, калгасьнікі і ўсе працоўныя Барысаўшчыны, пад непасрэдным кіраўніцтвам раённага камітэту КП(б)Б, перамагаючы гнілы лібералізм, нанесены сакрушальны ўдар па кулаку, змагаючыся з сабатажам перараджэнцаў і апартуністамі ў радах партыі, — дасягнулі раду перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама ў правядзеньні ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Мы дабіліся ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін выкананьня плану збораў жазагатовак на 103,5 проц., звароту насеньнязыкі на 102 проц., бульбазагатовак на 102 проц., мясазагатовак на 100 проц., загатовак ільнасемя на 100,9 проц., ільнавалакна — 96,5 проц. Поўнасьцю ссыпаны насеньныя і страхавыя фонды па калгасным і адна асобным сэктары. Засеяна азімага кліну 19.375 га замест 17.759 га ў 1931 годзе. Узьнята пад зяб 19.300 га замест 7.000 га ў мінулым годзе.

Змагаючыся за палітычнае і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за рэалізацыю праграмнага дакумэнту тав. Сталіна — яго ўмоў перамогі ў рабоце на вёсцы, — мы маем новы прыліў у калгасы ў колькасьці 500 гаспадарак, арганізавана новых 10 калгасаў. Праводзячы самаачыстку калгасаў ад клясава-чужых элемэнтаў, выкрыта і выкінута з калгасаў 125 кулакоў.

Мы разгарнулі на раёну агразоатэхнічны паход з масавым дзелам рабочых, калгасьнікаў, сельска-гаспадарчых спэцыялістаў і працоўных мас.

Мы, калгасьнікі, разам са спэцыялістамі сельскай гаспадаркі Барысаўшчыны, распрацаваўшы мерапрыемствы партыі па правядзеньні веснавой сяўбы і барацьбе за высокі ўраджай, у адказ на ліст калгасьнікаў Безлюцкай МТС т. Сталіну, бярэм на сябе наступныя абавязкі.

За цьвёрдую працоўную дысцыпліну

Сумленна працаваць — лёзунг перадавых калгасьнікаў — абавязваецца зрабіць здабыткам усіх калгасьнікаў і сельска-гаспадарчых спэцыялістаў раёну і на аснове гэтага — разгарнуць барацьбу за поўнае ажыцьцяўленьне прынятага 3 сэсіяй ЦВК СССР дадатковага пункту да статуту с.-г. арцелі аб узмацненьні цьвёрдай працоўнай дысцыпліны ў калгасах.

Ва ўсіх калгасах увесьці дыфэрэнцыяваную ацэнку працы калгасьнікаў у залежнасьці ад складанасьці, цяжару і важнасьці работы, што выконваецца кожным калгасьнікам, і ўстанавіць дыфэрэнцыяваныя нормы выпрацоўкі з улікам усіх асаблівасьцей калгасу і брыгады.

Замацаваць існуючыя і арганізаваць новыя пастаянныя вытворчыя брыгады, правёўшы прымацаваньне да вучастку брыгад на ўвесь пэрыяд севазвароту. Тэрмін выкананьня да 15 сакавіка г. г.

Ва ўсіх саўгасах і калгасах павысіць прадукцыйнасьць працы, увесьці зьдзельшчыну, разгарнуўшы барацьбу за скарачэньне накладных выдаткаў, за натуральную аплату калгаснага апарату ня вышэй норм, устаноўленых для лепшых калгасьнікаў.

За пэрыяд падрыхтоўкі да ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, лепшых калгасьнікаў разгарнуць сацыспаборніцтва і ўдарніцтва паміж саўгасамі, калгасамі, вытворчымі вучасткамі МТС, калгаснымі брыгадамі і паасобнымі калгасьнікамі на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы, забясьпечыўшы канкрэтнае кіраўніцтва сацыспаборніцтвам і ўдарніцтвам і сыстэматычную праверку заключаных сацдагавароў.

За ахову і ўмацаваньне грамадзкай і сацыялістычнай маемасьці

Устанавіць ахову агрэмаджанай маемасьці: насенных, страхавых і фуражных фондаў, сельска-гаспадарчага інвэнтару, калгасных фэрм і інш., забясьпечыўшы ахову сапраўды надзейнымі рабочымі саўгасаў і калгасьнікамі.

Правесьці праверку (чыстку) рахункаводаў, загадчыкаў гаспадаркі, конюхаў і вартаўнікоў. Выгнаць усіх клясава-варожых элемэнтаў і іх агентуру і вылучыць на гэту работу праверэных і клясава-ўстойлівых работнікаў. «Ніякай літасьці гэтым ворагам народу, ворагам працоўных. Вайна не на жыцьцё, а на сьмерць багатым і іх прыхлябальнікам, буржуазным інтэлігентам, вайна жулікам, чужаедам і хуліганам» (Ленін).

Рашуча праводзіць барацьбу з антыдзяржаўнымі, антыкалгаснымі тэндэнцыямі, дамагаючыся поршачарговага выкананьня з боку калгасаў і саўгасаў усіх сваіх абавязкаў перад дзяржавай, правільнага ведзеньня ўліку ў саўгасах і калгасах, бязьлітасна прыцягваючы усіх сабатажнікаў у гэтай рабоце да суровай судовай адказнасьці, як за ашуканства дзяржавы.

За высокі сацыялістычны ўраджай

Забясьпечыць выкананьне плану яравой сяўбы па раёну ў ліку 38.700 га.

Дасягнуць павышэньня ўраджайнасьці ва ўстаноўленым урадам для нашага раёну разьмеры на 1933 г.: па збожжавых — 9 цэнтн. з га, бульбе — 115 цэнтн. з га, тэхкультурах — 3 цэнтн. з га.

Увесьці на працягу 1933 г. ва ўсіх саўгасах і калгасах устаноўленыя севазвароты.

Ачысьціць, пратруціць і праверыць усхожасьць насеннага матар'ялу. Выканаць пастанову ўраду аб правядзеньні 100-процантнай радковай сяўбы па саўгасах і на 50 проц. па калгасах.

Весьці рашучую барацьбу са стратамі ў часе сяўбы і ўборкі ўраджаю, за высокаякасную апрацоўку глебы, праводзячы барацьбу з пустазельлем на палёх, забясьпечыўшы 100-процантную вывазку штучных угнаеньняў і на 60 проц. натуральнага ўгнаеньня ў зімовы час; дабіцца вывазкі гною ў колькасьці ня менш 50 проц. з нездрамаджанай часткі гаспадаркі калгасьнікаў на калгасныя палі.

Сабраць 50 тон попелу на прадпрыемствах, у школах, установах, калгасах і саўгасах да веснавой сяўбы. Правесьці тарфаваньне глебы на плошчы 50 га.

Скончыць рамонт інвэнтару, транспарту і збруі да 10 сакавіка г. г.

Выканаць тэрміны сяўбы, устаноўленыя ЦК КП(б)Б і СНК: збожжа і тэхкультур на працягу 12 дзён, бульбы і коранеплодаў — 15 дзён, праводзячы звышпаранную сяўбу ў грязь.

Не пазьней 1 сакавіка скончыць складаньне вытворчых плянаў па саўгасах, МТС і калгасах, давёўшы гэты плян да кожнага вытворцы брыгады.

Праверыць правільнасьць давядзеньня цьвёрдага пляну сяўбы яравых культур да кожнай аднаасобнай гаспадаркі да 20 лютага г. г., разгортваючы вакол гэтага шырокую масава-растлумачальную работу.

Праверыць да 15 лютага становішча жывёлы, асабліва коняй, гадоўлю маладняка і іх утрыманьне і рацыянальнае скарыстаньне кармоў, становішча жывёлагадоўчых фэрм і гэтым забясьпечыць узьняцьцё таварнай прадукцыі жывёлагадоўлі і падрыхтоўкі каня да веснавой пасеўкампаніі.

Арганізаваць да 10 лютага г.г. 100 гуртко ў па аўладаньні агра-тэхнікі пры саўгасах і калгасах, забясьпечыўшы пастаяннае кіраўніцтва з боку сельска-гаспадарчых спэцыялістаў.

Падрыхтаваць 850 чал. праз курсы масавай спэцыялізацыі і 50 старшынь праўленьняў калгасаў да 15 красавіка 1933 г.; 60 рахункаводаў да 1 мая г. г.; 80 брыгадзіраў паляводчых брыгад — да 1 мая і калгасных кадраў масавай кваліфікацыі да веснавой сяўбы — 150 чал.

Разгорнутае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце, нашы перамогі па ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, задачы правядзеньня чацьвертай бальшавіцкай вясны выклікаюць шалёнае супраціўленьне разгромленага, але яшчэ канчаткова подабітага кляса савага ворага — кулака, папа і інш. і патрабуюць, «каб разьвеяць у прах апошнія рэшткі паміраючых клясаў і разьбіць іх эладзейскія махінацыі» (Сталін), патрабуюць далейшай непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, далейшага ўмацаваньня магутнасьці пралетарскай дыктатуры, узьняцьця на вышэйшую ступень рэвалюцыйнай пільнасьці, патрабуюць умацаваньня баяздольнасьці кожнага зьвяна ў нашай рабоце.

Канфэрэнцыя, абвяшчаючы сябе цалкам мабілізаванай на бальшавіцкае правядзеньне адзначаных задач, заклікае ўсіх рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў і ўсіх спэцыялістаў сельскай гаспадаркі БССР на барацьбу за пасьпяховае выкананьне веснавой сяўбы, за высокі сацыялістычны ўраджай, за палітычнае і гаспадарча-арганізацыйнае ўмацаваньне саўгасаў, МТС і калгасаў.

Няхай жыве загартаваная ў баях сталёвая когорта сусьветнага камунізму — УсеКП(б) і яе ленінскі ЦК, на чале з бальшавіком бальшавікоў сталёвым Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з непахісным бальшавіком тав. Гікало!

Ільнаводчыя раёны аслабілі тэмпы ільназагатовак

Сіроцінскі, Мсьціслаўскі, Сеньненскі і Асьвейскі раёны своёй ганебнай работай зрываюць выкананьне рэспубліканскага пляну

Бездапаможнасьць і размагнэсаванасьць скуратаўскіх кіраўнікоў

ТАЛАЧЫНО. Запытайцеся ў старшыні Скуратоўскага сельсавету **Куляшова** чым тлумачыцца нездавальняючае становішча з ільназагатоўкамі, ён адкажа вам:

—Ня ведаю што і рабіць, здаецца, зроблена ўсё магчымае.

Тое-ж адкажуць вам упаўнаважаныя РК т. т. **Галуза і Пунінскі.**

Імкнна гэта бездапаможнасьць, думка, што «ўсё ўжо зроблена» — адна з асноўных прычын, якія трымаюць Скуратоўскі сельсавет на апошнім месцы па ільназагатоўках у Талачынскім раёне.

Фактычна загатоўчая работа па сельсавету амаль спынілася. Фактычна кіраўнікі сельсавету і ўпаўнаважаныя РК падтрымліваюць правакацыйныя і завучаныя байкі кулака аб тым, што «ільну няма». Даволі сказаць, што, па чыгаючы з 14 студзеня, у сельсавеце спынілі складаньне зводак, бо, бачыце, «усё роўна прырост нязначны і ня варта складаць зводкі».

Іншымі словамі, кіраўніцтва дэмабілізавалася і супакоілася на «дасягнутым» па — 52 проц. пляну па валакно і па 67 проц. заданьня па ільнасемі.

Кіраўнікі Скуратоўскага сельсавету і ўпаўнаважаныя РК не зразумелі новых форм клясавай барацьбы, новай абстаноўкі, у якой праводзяцца загатоўкі. Яны не заўважваюць кулакоў, якія спакойна сядзяць у калгасах і робяць там сваю справу.

З 12 калгасаў сельсавету толькі адзін — «Чырвоны барацьбіт» — поўнасьцю выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. Іншыя затрымліваюць прадукцыю, спчаць аб адсутнасьці ільну. Калгас «Чырвоны перадавік» замест 90. цэнтн. здаў 24; «Чырвоная зара» замест 54 — 17. **Калгасны сэктар у цэлым выканаў сваё заданьне па ільна валакне на 50-51 проц.**

Пад маскай калгасьнікаў хаваюцца кулакі і заможнікі, якія сабатуюць загатоўкі. Вось, для прыкладу, калгас «Чырвоная зьмена», які мае 9 гаспадарак. Гэтыя гаспадаркі засялі лён яшчэ да ўступленьня ў калгас, а зараз яны ўпарта адмаўляюцца здаць валакно дзяржаве. Сярод сабатажнікаў — член сельсавету, «актывіст», **Трыпуцін Ільля.**

У калгасах «Чырвоная зара», «Чырвоны перадавік», «Перамога» лён скошвалі па подсьціл жывёле, гнаілі ў копах, раскрадалі, або толькі ня здаць дзяржаве.

А кіраўнікі сельсавету і ўпаўнаважаныя РК разводзілі рукамі, ня ведалі што рабіць.

Ня лепш стаіць справа па аднаасобным сэктары. Тут плян па ільнавалакну выкананы на 56,8 проц., па ільнасемі — на 45 проц. Вёска Сеньнікі замест 40 цэнтн. ільнавалакна здала 21, Арава замест 22 — 13. У члена камісіі содзейнасьці **Бычкова** прышлося канфіскаваць пралку. Ня выконваюць сваіх заданьняў члены сельсавету Аляксеў, Апупры Трыпуцін, члены партыі — Жураўлёў, Снапкоўскі і інш.

Адзін за другім з сельсавету ўцяклі, узяўшы з сабой маемасьць, цьвёрдазаданьнікі Хаміцкія Г. і Л., Снапкоўскі С., Пажарыцкі. А сельсавет іх «не заўважыў».

Некалькі слоў аб парт'ячэйцы. Сакратаром ячэйкі на працягу году зьяўляўся нейкі Бэйнэр, які два гады не плаціў членскіх узносаў. Толькі месяц назад райком выключыў яго з партыі й зьняў з работы. Адкак, дагэтуль другога сакратара райком ня вылучыў.

Аб выразнасьці кіраўніцтва РВК сьведчыць такі факт: калгас імя Варашылава дагэтуль дакладна ня ведае свайго заданьня па ільназагатоўках, бо ў сьпісах сельсавету за ім лічыцца 45 цэнтн. валакна, а паводле заданьня райарганізацыі, — толькі 32 цэнт. Дагаварыцца з сельсаветам райарганізацыям, як відаць, цяжка...

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»
Б. ПАПОЎ, С. ГАЛКІН.

Ход загатовак ільнавалакна

(У процантах да гадавога пляну на 6-га лютага па ільнаводчых раёнах)

№№ па ч.	Назва раёну	Паступіла за дзень	Проц. выканан. гадав. пляну
1.	Чавускі	—	101,4
2.	Бальшыцкі	—	97,8
3.	Лёзьнянскі	—	96,3
4.	Сураскі	—	93,8
5.	Чашніцкі	0,8	92,9
6.	Крупскі	0,4	89,4
7.	Дубровенскі	0,2	86,2
8.	Шклоўскі	0,4	86,1
9.	Талачынскі	1,3	82,6
10.	Горацкі	0,1	82,4
11.	Гарадоцкі	—	81,0
12.	Расонскі	—	79,5
13.	Полацкі	0,9	78,0
14.	Дрысьенскі	—	77,0
15.	Вушацкі	0,1	75,6
16.	Лепельскі	0,5	75,0
17.	Бешанковіцкі	0,4	73,4
18.	Сеньненскі	0,2	71,6
19.	Асьвейскі	—	69,1
20.	Мсьціслаўскі	0,3	67,3
21.	Сіроцінскі	0,3	60,1
	Разам па ільнаводчых раёнах	0,3	82,2
	Разам па БССР	0,3	84,1

На повадзе ў кулацкіх элемэнтаў

ТАЛАЧЫНО. Праўленьне калгасу імя 1 мая, Перавалочкага сельсавету, на чале са старшынёй **Васілеўскім** і старшынёй рэвізійнай камісіі, сарвала ільназагатоўкі.

Калгас атрымаў сэсім рэальны плян загатовак ільнавалакна і мог яго выканаць у тэрмін. Але праўленьне, замест ударнай работы па загатоўках, пайшло на повадзе ў кулацка-заможных элемэнтаў. Лён, які быў засеяны на плошчы 2 га, загніў, ураджай быў вельмі малы. Апрача таго, наліраліся факты разбазариваньня ільнавалакна, абмену яго на сала. Старшыня праўленьня Васілеўскі і яго сябар Верпіноўскі сказалі шмат ільну.

Трэба судовым органам умяшацца ў гэту справу.

ЗОРКІ.

ЧОРНАЯ ДОШКА

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР занесены на чорную дошку наступныя раёны:

ЗА ЗРЫЎ ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ:

ТАЛАЧЫНСКІ (сакратар РК тав. **Славін**, старшыня РВК тав. **Семашко**, упаўнаважаны ЦК тав. **Шаліма**).

СЕНЬНЕНСКІ (сакратар РК тав. **Дашуневіч**, старшыня РВК тав. **Себісевіч**, упаўнаважаны ЦК тав. **Берзін**).

СІРОЦІНСКІ (сакратар РК тав. **Усенка**, старшыня РВК тав. **Ранніоўні**, упаўнаважаны ЦК тав. **Вільчан**).

За зрыў загатовак усіх відаў занесены на чорную дошку наступныя сельсаветы:

па **Дзяржынскім:** в. Шатакаўшчына; па **Бягомльскім раёне:** Дамбражыцкі сельсавет; па **Чашніцкім раёне:** Стражэвіцкі; па **Клічаўскім:** Біркаўскі; на **Сураскім:** Камароўскі; па **Аршанскім:** Буеўскі; па **Пухавіцкім:** Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі; па **Вушацкім раёне:** Усайскі; па **Мсьціслаўскім раёне:** Тагаршанскі сельсавет.

Шкоднікі падрываюць калгас

ЛЕПЕЛЬ. Лепельскі раён — адзін з самых адсталых па ільназагатоўках сярод раённых ільнаводных раёнаў БССР. Адной з прычын адставаньня Лепельшчыны зьяўляецца сабатаж ільназагатовак з боку кулацкіх элемэнтаў, якія пралезьлі ў калгасы і вядуць там падрыўную работу. Возьмем для прыкладу становішча ў калгасе «Адказ інтэрэнтам», Валасоўскага сельсавету.

Старшыня калгасу **Логвін Фядос**, замест кіраўніцтва загатоўкамі, увесь час патураў найбольш адсталым элемэнтам, шукаў па повадзу замокнай часткі і імкнуўся перш-на-перш задаволіць свае шкурніцкія інтарэсы.

Рахункавод **Баркавец** —ён-жа член сельсавету — былы стражнік, удзельнік банды Семянікова.

Загадчык гаспадаркай **Трубэка**, — злодзей і п'яніца.

Вось гэта хаўра прывяла калгас да развалу.

Яшчэ ў мінулым годзе ня менш 150 пудоў ільнасемя ўраджаю 1931 году было пакінута па адкрытым таку, у выніку чаго насеньне распрадзена.

Было засеяна 27 га ільнасемя, а дзяжкае зжана 19 цэнтн. Большасьць прадукцыі распрадзена, разбазарана праўленьцамі.

Рахункавод Баркавец атрымаў для калгасу 120 пуд. жыта, пры чым 24 пуды прысвоіў сабе без ведама праўленьня.

Кіраўнікі калгасу прадалі 12 вазоў сена брату рахункавода

Стопроцантнай ссыпкай насеньня, і свачасовым рамонтам трактараў і машын, падрыхтоўкай жывой цягавай сілы забясьпечым выкананьне пасеўных плянаў

Прыйнята Наркамземам СССР і зацверджана Саўнаркомам СССР 5-га лютага 1933 г.

ПРЫКЛАДНЫ ДАГАВОР
МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ З КАЛГАСАМІ

Мы, машына-трактарная станцыя... і асобе дырэктара... і калгас... у асобе яго старшыні (або яго намесьніка) ... заключылі гэты дагавор:

1. Машына-трактарная станцыя абавязваецца сваімі трактарамі, сельска-гаспадарчымі машынамі і прыладамі правесьці ў калгасе работы па апрацоўцы глебы, пасеву, міжрадная апрацоўцы, уборцы і малацьбе ў разумерах, якія ўстанаўліваюцца на аснове спэцыяльнай згоды МТС з калгасам і вытворчага пляну калгасу.

2. Машына-трактарная станцыя абавязваецца снабжаць за свой кошт трактары гаручым і змазачным матар'ялам, правесьці за свой кошт не вялікі рамонт трактараў і машын, а таксама аплачваць увесь агранамічны і тэхнічны персанал станцыі.

3. Машына-трактарная станцыя абавязваецца аказваць пастаянную дапамогу калгасу ў справе яго арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня шляхам агранамічнага абслугоўваньня калгасу, складаньня яго вытворча-фінансавых плянаў, устанаўленьня правільнага севазвароту, сацыялістычнай калгасу ў справе арганізацыі працы і разьмеркаваньня даходаў, падрыхтоўкі калгасных кадраў і пастаянкі ўліку.

4. Усе без выключэньня палявыя работы, у тым ліку і работы на трактарах, выконваюць самі калгасьнікі ў парадку, які ўстанаўліваецца машына-трактарнай станцыяй па згодзе з калгасам. Калгас абавязваецца правесьці дастаўку гаручага і машын са станцыі чыгунак да месца работы і падвозку вады да месца работы трактараў.

5. У мэтах павышэньня ўраджайнасьці і даходнасьці гаспадаркі калгас абавязваецца правесьці агранамічныя правілы, устаноўленыя РВК, і па патрабаваньні МТС усе іншыя неабходныя агракультурныя палепшэньні і ўмовы на сваіх палёх зацверджаны РВК севазварот.

6. Калгас абавязваецца прыняць меры да найбольшага накапленьня гною як ад аграмаджанай жывёлы, так і часткова ад жывёлы, што знаходзіцца ў калгасьнікаў, правільна і бераклівa захоўваць гной і вывозіць яго на палі, згодна пляну, выпрацаванага МТС.

7. Устаноўка сьліпчтаў і малацьба збожжа правесьціцца ў паўных мясцох па ўказаньні станцыі. Падвозка прадукцыі, якая належыць МТС за яе работы, да чыгуначных станцый, прыстаней, элеватараў і заводаў правесьціцца перавозачнымі сродкамі калгасу за яго кошт.

8. У мэтах найбольш прадукцыйнага выкарыстаньня складаных сельска-гаспадарчых машын, належачых калгасу, МТС купляе ў калгасе, па асобнай згодзе, усе складаныя малатарні і лёкамабілі.

9. У скасаваньне існаваўшай сыстэмы аплаты калгасамі работ МТС па цьвёрдых расцэнках, устанавіць аплату работ МТС у поўных процантах ад ураджаю калгасу. У скасаваньне існаваўшай сыстэмы аплаты калгасамі работ МТС грашыма, устанавіць аплату натурай (збожжам, буракамі, бавоўнай, ільном і г. д.).

10. За правядзеньне машына-трактарнай станцыяй на палёх калгасу ўсіх асноўных сельска-гаспадарчых работ МТС атрымлівае ад калгасу ў аплату сваіх расходаў натурай 20 проц. ураджаю па збожжу, кукурузе, сланечніку, бавоўне і ільну, 17 проц. па буракох і 16 проц. па бульбе.

У поўны пералік усіх асноўных сельска-гаспадарчых работ уваходзяць:

па збожжу—ворыва, пасеў, касьба, малацьба або ўборка камбайнамі;

па кукурузе—ворыва, пасеў, культывацыя і ўборка;

па сланечніку—ворыва, пасеў, культывацыя і малацьба;

па бавоўне—два ворыва, пасеў, культывацыя і збор;

па буракох—глыбокае ворыва, пасеў, культывацыя і капаньне;

па бульбе—глыбокае ворыва, пасеў і капаньне;

па ільну—два ворыва, пасеў і церабленьне.

11. У выпадку, калі МТС у калгасе праводзіць ня ўсе асноўныя сельска-гаспадарчыя работы, пералічаныя ў п. 10, а толькі асобныя работы, калгас аплачвае МТС кожную праведзеную работу ў процантах ад ураджаю ў наступных разьмерах:

а) па збожжавых коласавых культурах: за веснавое ворыва і ўдым папарою—10 проц., за зяблевае ворыва—9 проц., пасеў—3 проц., касьбу—4 проц., малацьбу—8 проц. ад ураджаю;

б) па кукурузе: за ворыва — 10 проц., пасеў—3 проц., кожную культывацыю—па 1,5 проц., уборку пікерам—9 проц. ад ураджаю;

в) па сланечніку: за ворыва—10 проц., пасеў—3 проц., кожную культывацыю—1,5 проц., малацьбу—8 проц. ад ураджаю;

г) па бавоўне: за ворыва першае—10 проц., за другое ворыва—7 проц., пасеў—1 проц., кожную культывацыю па 1 проц., уборку турман-вакуумамі—8 проц. ад ураджаю;

д) па буракох: за глыбокае ворыва—10 проц., пасеў—2 проц., кожную культывацыю па 1 проц., капаньне—5 проц. ад ураджаю;

е) па бульбе: за ворыва—9 проц., пасеў—3 проц., уборку—6 проц. ад ураджаю;

ж) па ільну: за ворыва першае — 8 проц., другое ворыва — 5 проц., пасеў — 2 проц., церабленьне — 10 проц. ад ураджаю.

12. Да моманту пачатку малацьбы МТС і калгас пагаджаюць усе работы праведзеныя МТС і вызначаюць процант валавой прадукцыі калгасу, які належыць машына - трактарнай станцыі за яе работы — па ўсіх збожжавых, кукурузе і сланечніку разам і асобна па кожнай з пералічаных вышэй тэхнічных культур і бульбе.

Разьлікі па работах, праведзеных МТС да пачатку малацьбы, правесьціцца з першых партый намалочанага збожжа, але не пазьней аднаго месяца пасьля пачатку абмалоту, а за малацьбу разьлік правесьціцца па меры абмалоту. Валавы збор збожжа па кожным калгасе, які абслугоўваецца МТС, па аснове ўстаноўленай міжрэйнай дзяржаўнай камісіяй ураджайнасьці для даннага раёну, вызначаецца спэцыяльнай камісіяй у наступным складзе: старшыня або нам. старшыні РВК, райўпаўнаважаны КамзагСНА, дырэктар адпаведнай МТС і старшыня адпаведнага калгасу. Збожжа і сланечнік, якія прылічаваюцца МТС за работу, здаюцца калгасам усімі збожжавымі культурамі і сланечнікам, прапарцыянальна пасеўным плошчам кожнай культуры.

Па буракох, бавоўне і бульбе разьлікі правесьціцца з першых партый сабранай прадукцыі.

Разьлікі па ільну праведзіцца пасьля стой або валакном, прапарцыянальна ўстаноўленаму для калгасу пляну здачы для заводскай і па-заводскай апрацоўкі з першых партый трасты і валакна.

Ураджайнасьць па буракох, бавоўне, ільну і бульбе вызначаецца асобнай камісіяй ў складзе старшыні або нам. старшыні РВК, дырэктара адпаведнай МТС, старшыні адпаведнага калгасу і прадстаўніка адпаведнай заготоўчай арганізацыі.

Разьлікі па астатніх культурах праводзіцца не натурай, а грашыма ў тэрміны і на ўмовах па асобнай згодзе МТС з калгасам.

Работы МТС па ўздыму папараў, азімай сяўбе і зяблевым ворыве праводзіцца ў парадку бясспроцантнага крэдыту калгасу з аплатай натурай з ураджаю наступнага году.

13. МТС і калгас абавязваюцца беражліва і клапатліва абыходзіцца з трактарамі, коньмі, сельска-гаспадарчым інвэнтаром, насеньнем і іншай маемасьцю МТС і калгасу, ужываючы ў адносінах да работнікаў МТС і членаў калгасу, вінаватых у нядбайным хаваньні і абыходжаньні з дзяржаўнай і калгаснай маемасьцю, найстражэйшыя спагнаньні, аж да выключэньня з калгасу, зьняцьця з работы ў МТС, спагнаньні нанесеных страт, а ў адносінах асоб, вінаватых у злосных адносінах да маемасьці калгасу і МТС — прыцягненьне да крымінальнай адказнасьці па закону аб ахове грамадзкай уласнасьці.

14. МТС не радзей аднаго разу ў тры месяцы робіць справаздачу ў сваёй рабоце перад працаўленьнем і агульным сходам калгасьнікаў. Для ўстанаўленьня цясьнейшай сувязі паміж станцыяй і калгасам пры МТС арганізуецца вытворчы савет у складзе прадстаўнікоў ад кожнага калгасу. Вытворчы савет зьбіраецца па меры патрэбы, але не радзей аднаго разу ў месяц.

15. За парушэньне дагавору ў цэлым і ў асобных яго частках вінаваты бок адказвае перад другім у наступным парадку: МТС кампэнсуе калгасу нанесеныя ім страты ад парушэньня дагавору з боку МТС (дрэнная работа, невыхаванне тых або іншых абавязацельстваў па дагаворы і г. д.) грашыма ў паўтаракратным разьмеры нанесеных калгасам страт па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах і апрача таго дырэктар МТС прыцягваецца да судовай або адміністрацыйнай адказнасьці, калгас кампэнсуе МТС нанесеныя ёю страты ад парушэньня дагавору з боку калгасу (дрэнная работа, невыхады на работу, якія цягнуць за сабой страты машын і невыкананьне вытворчага пляну, паломка машын і г. д.) грашыма ў паўтаракратным разьмеры нанесеных МТС страт па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах, а за нядбаду калгасам машына - трактарнай станцыі прадукцыі, якая прылічаецца ёй за работу, з калгасу спагнаецца гэта прадукцыя ў бясспрэчным парадку, і апрача таго грашовы штраф у разьмерах паловы кошту недадзенай прадукцыі ў дзяржаўных цэнах.

Дырэктар МТС.
Праўленьне калгасу.

„Пераможныя гімны" аршанскага райза і сапраўднасьць

ВОРША. (Наш кар.) Старшыня РВК аказаўся вельмі «нетактычным». Ён пазасвіў канчаткова антымістычны настрой райза т. Жылінскага, які прыйшоў на пасяджэньне з выглядам пераможцы, з запэўненьнямі, што падрыхтоўка да веснавой сяўбы ведзецца паўдоўжаму, насеньфонды ссыпаюцца, інвэнтар рамонтуецца і г. д. Тав. Валасевіч узяў пад сумненьне «тэзісы» дакладу райза і выступіў з вельмі «ня прыемнай» прамовай, у якой паказаў адказ адваротнае.

Аналізам райза быў разьбіт ушчэнт і ня толькі выступленьнем Валасевіча, а яго-ж, Жылінскага уласнымі лічбамі і зводкамі. Вось, напрыклад, зводка райза аб ссыпцы насеньных і страхавых фондаў. На 27 студзеня калгасы сэктар раёну ссыпаў насеньны фонд: па збожжавых культурах—на 97 проц., тэхнічных—на 67 проц., па бульбе—на 108,9 проц.

Страхавы фонды ссыпаны: па збожжавых—на 86,9 проц., тэхнічных—на 57,3 проц., па бульбе—на 101 проц. Такім чынам, калгасны сэктар недавыканаў яшчэ план па збожжавых культурах і яўна зрывае ссыпку насеньня тэхнічных культур.

Аналіз зводкі ў разрэзе сельсаветаў дае яшчэ горшы малюнак. На некаторых сельсаветах калгасы ня выканалі нават і палавы заданьня. Так, калгасы Машкоўскага сельсавету ссыпалі насеньне тэхнічных культур на 44,7 проц., Веравойшынскага — на 42,7 проц., Скальлянскага—на 42 проц., Шатэйўскага—на 38 проц. Калгасы Высоцкага, Каксўчынскага, Машкоўскага і Стайкаўскага сельсаветаў дагатуль не прыступілі да стварэньня страхавых фондаў насеньня тэхнічных культур.

Ссыпка страхавых фондаў па адпаведным сэктары таксама зрываецца. Заданьне выканана па збожжавых на 66,1 проц., па тэхнічных—на 49,6 проц., па бульбе—на 62,6 проц. На рэзке сельсаветаў—Варанскім, Копыскім, Малатчынскім, Межаўскім, Стайкаўскім і іншых адпаведным сэктар не прыступіў да ссыпкі страхфондаў па бульбе і тэхкультурах, а ў Сталінскім і Якаўлевіцкім сельсаветах—нават і па збожжавых.

Так выглядае на справе становішча на адным з важнейшых участкаў падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі, ста становіча, якое зусім не супадае з «пераможнымі гімнамі» райза.

Але і ссыпаныя насеньныя фонды не ахоўваюцца належным чынам. Кля савы вораг і яго агентура ўжо зараз разгортваюць актыўнае супраціўленьне падыходзячай веснавой пасеўной кампаніі і ўсімі спосабамі імкнуцца сарваць падрыхтоўку да яе. Адзін з мэтодаў супраціўленьня клясавага ворага—гэта раскрадзеньне і разбазаваньне насеньных фондаў калгасаў. Такія факты ўжо маюць месца. У калгасе «Прагрэс», Багушэўскага сельсавету, клапаўшчык сыстэматычна крадзе калгасную насеньню. Ён абважваў кал тасьнікаў, браў ад іх больш, чым трэба было, а розьніцу забіраў сабе. Пры праверцы ў яго знойдзена папраўзеных такім чынам 30 пудоў насеньня. Факты пакражы насеньня ёсьць і ў іншых калгасах і сельсаветах. Гэта вышк дрэннага хаваньня насеньных фондаў, невыстарчальнай пільнасьці праўленьняў калгасаў і мясцовых органаў улады.

**
*

Плян сяўбы, даведзены Наркамземам БССР, у Воршы быў «папраўлен». Раённыя арганізацыі знайшлі магчымы, паперакор дырэктывам партыі і ўраду, урэзаць яравы клін пад збожжавыя культуры, прычым «урэзка» атрымалася дамоі значная. Зьвернемся да лічбаў.

У мінулым годзе па раёне было засеяна пад збожжавыя культуры 36.386 га зямлі. Сёлета па пляну Наркамзему БССР яравы клін збожжавых павінен складаць 37.080 га. Што-ж зрабілі раённыя арганізацыі пры даведзеньні пляну да сельсавета? Яны скарацілі яравы клін пад збожжавыя культуры да 36.180 га, г. зн. на 900 га ніжэй кантрольнай лічбы НКЗ і на 206 га менш пасеву мінулага году. Адпаведна скарочан плян сяўбы пшаніцы на 200 га ніжэй кантрольнай лічбы і на 109 га менш пасеву мінулага году, пад авёс—на 200 і на 306 га, пад ячмень—на 300 і на 9 га.

У райвыканкоме і райза гэта скарачэньне тлумачаць адпаведным павялічэньнем яравога кліну пад іншыя культуры. Але напрошваецца пытаньне, ці можа быць апраўдана гэтым грубейшае парушэньне дырэктыў партыі і ўраду? Хто дазволіў раённым арганізацыям абыйсьці пастанову ЦК і СНК, якая катэгарычна забаранае скарачаць плошчу пасеву збожжавых культур?

«Папраўлены» такім чынам плян быў спушчан у сельсаветы ў пачатку ступеня, але да гэтага часу ён усё яшчэ карэктуецца. Сельсаветы, са свайго боку, робяць свае папраўкі, прычым у шасобных выпадках гэтыя «папраўкі» розка разыходзяцца з плянаваньнем райза. Шыбецкі сельсавет, напрыклад, замест 762 га даведзеных яму райза, прыняў толькі 460 га (на 301 га менш), Якаўлевіцкі замест 1302 га—897 га (на 405 га менш), Пішчалаўскі, замест 477 га—414, (на 63 га менш).

Наадварот, да некаторых сельсаветаў даведзены яўна перапаменшаныя кантрольныя лічбы. Так, Высоцкі сельсавет прыняў замест 445 га, вызначаных планам, 569 га (на 124 га больш), Кратвоўскі замест 1720 га—1888 (на 148 га больш), Пашкоўскі сельсавет замест 480 га—761 (на 280 га больш).

Так ці інакш, але плян яшчэ «карэктуецца» і канчаткова не зацьверджан. Некаторыя сельсаветы (Менаўскі, Малатчынскі, Капыскі, Дубоўскі, Астапенскі, Роска-Сялецкі) да 31 студзеня яшчэ нават не вярнулі пляны ў райза і не далі ніякіх вестак.

Цэнтральная задача пасеўнай кампаніі гэтага году зьяўляецца барацьба за ўзьнімцце ўраджайнасьці, за палепшэньне якасьці апрацоўкі глебы, за шырокае правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў.

Раённыя арганізацыі ўстанавілі наступныя мінімальныя нормы ўраджайнасьці на 1933 год: па збожжавых культурах: для калгасаў — 9,5 цэнт. з га, для адпаасобнікаў—9 цэнт., па бульбе: для калгасаў—120 цэнт., для адпаасобнага сэктару—117 цэнт.; па ільну: для калгасаў і для адпаасобнікаў—3,4 цэнт. з га. Зусім зразумела, што для ажыцьцяўленьня гэтых норм неабходна шырокая папулярызацыя агратэхнікі сярод калгасьнікаў і працоўных адпаасобнікаў, практычная дапамога ў падрыхтоўцы і ў самым праведзеньні сяўбы.

Але іменна гэтага няма. Калі старшыню аднаго калгасу Малатчынскага сельсавету спыталі, якія аграмерапрыемствы калгас мяркуе правесьці для ўзьнімцця ўраджайнасьці, ён адказаў:

— Нам аб гэтым ніхто нічога не гаварыў, мы ня ведаем, што гэта за аграмерапрыемствы.

У гэтым адказе няма нічога дзіўнага, бо спэцыялістаў агранома, якія-б шырока растлумачылі задачы ўвядзеньня агратэхнікі, па мясцох няма. У раёне ўсяго 6 агранома ў і тыя ўсе сядзяць у раённым цэнтры, у канцылярыях.

Гурткі агра-зоатэхвучобы пакуль што існуюць толькі ў плянах, на паперы. Іх павінна быць на раёне 480, а колькі ёсьць і як яны працуюць—сакрэт райза, правільней, сакрэт і для райза. Тут толькі ведаюць, што плян падрыхтоўкі кадраў ня выконваецца, што гэтых кадраў не хапае.

Наогул для райза шмат што зьяўляецца сакрэтам. Напрыклад, ачыстка насеньня. Вядома, што калгасы павінны на пляну ачысьціць 38.816 цэнт. насеньня, адпаасобны сэктар—23.890 цэнт. А колькі ўжо ачысьцілі, як ідзе гэта работа на мясцох—аб гэтым ніхто ня ведае. Зводкі не складаюцца, справа пакінута на самацёк. Але на наступаючых малар'ялах з месц відаць, што ў значнай частцы калгасаў і вёсак ачыстка насеньня праходзіць слаба, а сям-там (паасобныя вёскі Сталінскага і Якаўлевіцкага сельсаветаў) яе зусім і не распачынялі.

Самацёкам ідзе таксама збор попелу, вываска гною і г. д. Усіх гэтых райза кіруе зусім дрэнна, ідзе на ведае, што робіцца на мясцох.

Кіруючыя раённыя арганізацыі Аршаншчыны павінны забясьпечыць спакойны і розкі пералом у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Трэба мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і працоўных адпаасобнікаў на барацьбу з кулацкім сабатажам падрыхтоўкі і праведзеньня веснавой сяўбы, на рашучы адпор клясаваму ворагу і яго агентуры.

«Асноўная ўвага ў падрыхтоўцы і праведзеньні веснавой сяўбы павінна быць зьвернута на поўную і добраякасную падрыхтоўку насеньня, недапушчэньне малейшага спазьненьня з сяўбой і на поўнае выкананьне пляну сяўбы, скарачэньне тэрмінаў сяўбы і рашучае палепшэньне якасьці апрацоўкі глебы, на правядзеньне ранняга ворыва, свачасовую падрыхтоўку цягавай сілы, трактараў і машын і іх добраякасны рамонт, свачасовы і поўны вываз мінэральных угнаенняў» (з пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР).

Гэту дырэктыву партыі і ўраду бальшавікі Аршанчыны павінны выканаць па-баявому.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»—
Б. ПАПОЎ, С. ГАЛКІН.

ГОМСЕЛЬМАШ ЗРЫВАЕ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ І ВЫРАБ ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Гомсельмаш заключыў дагаворы з саўгасамі суседніх раёнаў на рамонт 49 трактараў. Паводле дагавораў саўгас «Чырвоная зорка» Жыткавіцкага раёну павінен даставіць для рамонту 5 трактараў, саўгас «Дчоса-рудня» Веткаўскага раёну — 9 трактараў, саўгас «Пралетарыі» Церахаўскага раёну — 12 трактараў, Слабада» Мазырскага раёну — 2 трактары, саўгас «Кірыгалава», Пятрыкаўскага раёну — 7 трактараў і «Брылева» Гомельскага раёну — 4 трактары.

50 процантаў пералічаных трактараў трэба было адрамантаваць не пазьней 1 лютага. **Між тым трактары дагэтуль на завод не дастаўлены і рамонт іх па сутнасьці сарваны.** Саўгасы «Неглюбка» і «Каменка» нават не заключылі дагавораў.

Дагаворы пагадзяюць бюракратычныя паперкі. У іх нават ня вызначан тэрміны рамонту, не паказаны дэфэкты трактараў. Завод зусім ня ведае, які рамонт трэба зрабіць у тым ці іншым трактары.

З дастаўленых на завод 7 поўных комплектаў трактарных матораў і сямі калейчатых валаў — пакуль ні адзін не адрамантаваны.

З вырабам запасных частак ня лепш. Гомсельмаш заключыў дагавор з Сэльбрамонтам на выраб 7.500 шатунных балтоў з гайкамі, 100 шт. дыскаў муфт сцяпленьня, 2 тысячы поршняў, 400 стаканаў палівпрацэ і 200 каробак для чарвячнай шасьцярні. Паводле загаду Белмэталтрэсту ўсе гэтыя часткі павінны быць зроблены з матар'ялаў заказчыкаў. І вось завод лічыць:

— Паколькі заказчык нам ня даў матар'ялаў (з якіх можна было-б рабіць запасныя часткі, — мы тут ні прычым...

І па сутнасьці да вырабу запасных частак завод таксама не прыступіў.

Дагэтуль завод ня мае рабочых чарцяжоў частак, якія ён павінен выраблять, без чаго зусім немагчыма прыступіць да масавага выпуску запасных частак. У дагаворы прапушчана нават такая «дробязь», як шліфоўка ўнутранай часткі паверхні стакана цылідру і таму зараз завод павінен гадаць, хто-ж гэтую шліфоўку будзе рабіць.

Грамадскасьць заводу зусім не мабілізавана на дапамогу саўгасам у падрыхтоўцы да сяўбы, па фарсаваньне рамонту трактараў і выраб запасных частак. Нават адказныя брыгадзіры ня ведаюць тэрмінаў выкананьня рамонту і здачы частак заказчыкам.

З першай партыі лічыць першынай аказалася калі 80 процантаў брэкт. На заводзе апрацоўваюцца тым, што яны не асвоілі яшчэ новых працэсаў работы. Па сутнасьці-ж працэс ліцьцы для Гомсельмашу справа зусім новая, тлумачыць ім вялікую колькасьць браку цяльга. Увага рабочых не завострана на барацьбе з бракам і ні разу ня ставілася на тэхнічнай нарадзе.

Усё гэта прывяло да таго, што заказы на рамонт трактараў і выраб запасных частак сарваны. Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ня выконваюцца.

Завод-падраўніцтва і грамадзкія арганізацыі Гомсельмашу павінны памятаць, што ім ня ўнікуць адказнасьці за свачасовы рамонт трактараў і выраб запасных частак. Завод гэтай справы павінна быць зараз мабілізавана ўся ўвага заводскага калектыву. Пізьніх перабоў не павінна быць.

Гомсельмаш можа і павінен у бліжэйшыя-ж дні пачаць бесперабойны рамонт трактараў і выраб запасных частак.

Мы просім Упаўнаркамсаўгасу прыцягнуць да адказнасьці дырэктароў саўгасаў, якія дагэтуль не даставілі на завод трактары для рамонту.

Рабцэвіч.

Міхась Сакалоўскі

Аб трактарнай майстэрні і „спартсмэнах"

Прычым-жа тут «спартсмэны» і трактарная майстэрня — са яўдзіўленьнем запытаецца чытач. Аказваецца, ва Ўраравічах паміж імі існуе цесная залежнасьць. Аб ёй мы і хочам расказаць.

Есьць такая гульня, калі людзі становяцца адзін супроць другога ў два рады і стараюцца вайхутчэй адкінуць ад сябе другому мяч. Аналягічную гульню пачалі паміж сабой Белмалакопрамтрэст, кіраўніцтва ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў, дырэктар саўгасу Ўраравічы Скроб і дырэктар аўтатрактарнага тэхнікуму — Цярэшка. Толькі гэтыя «спартсмэны» аб'ектам гульні ўзялі ня мяч, а трактарную майстэрню, якая, як і тэхнікум, знаходзіцца на тэрыторыі саўгасу Ўраравічы.

Вясной мінулага году трактарная майстэрня была пад ведамам аўтатрактарнага тэхнікуму. Ня маючы эканамічнай базы і жаданьня арганізаваць работу майстэрні, тэхнікум давёў яе да заняпаду. Тады пасьлядовала распаладжэньне з Белмалакопромтрэсту — прыняць майстэрню саўгасу Ўраравічы.

Саўгас майстэрню прыняў. Але прыняў з такім разьлікам, каб яшчэ скінуць са сваіх плеч. Цяжкай падрыхтоўкі да рамонту трактараў ня было праведзена. Больш таго, дырэкцыя саўгасу часта зрывала сьлесараў з майстэрні на розныя другія работы. Калі загадчык майстэрні тав. Варапаеў прабаваў пратэставаць, намесьнік дырэктара Паўлаў начальніцкім тонам заяўляў:

— Гэта што такое! Апэляваць на мае распараджэньне?! Не дазволю! Хто тут гаспадар — ты ці я?

Такім чынам атрымаліся ад майстэрні лішнія сьлесары, як тав. Чаботкін, Курачэнка і інш. А калі яны часамі затрымліваліся, дык ляцела грозная запіска: «тэрмінова адпусьціць».

Саўгас у асобе дырэктара Скроба не патурбаваўся абсталяваць майстэрню. Яна засталася такой, як была арганізавана калісьці. Характэрна, што саўгас дагэтуль ня выкупіў з Гомельскай майстэрні калейчаты і масьляны вал ад рухавіка, не «знайшлі» 700 руб. грошай, каб заплаціць за рамонт. А рухавік вельмі патрэбны майстэрні, тым больш, што адчуваецца недахват рабочых.

Мы не сумняваемся ў тым, што тав. Скроб адкажа: «ня я вінаваты, а дырэктар тэхнікуму Цярэшка». Добрую лазейку для яго, як і для Цярэшкі, стварыў прыехаўшы 13 студзеня прадстаўнік упаўнаркамсаўгасаў Беларусі, адказны за рамонт трактараў, тав. Фрыд. Ён зьявіўся і зьнік, нібы матэор, пакінуўшы лёкаічны безапэляцыйны загад:

«У 24 гадзіны перадаць майстэрню аўтатрактарнаму тэхнікуму». І ўсё.

Скроб задаволены. З дапамогаю Фрыда яму ўдаўся чарговы трук гульні з майстэрняй. Яна зноў перакінута ў ведама аўтатрактарнага тэхнікуму, вярней у ведама яго дырэктара Цярэшкі.

Куды-ж трапіла майстэрня? Дамо слова кантралёру саўгасу Ўраравічы тав. Шыцько.

— Вы кажаце тэхнікум? Над суд трэба аддаць, хто гэту ўстанову стварыў і назваў такой назвай. Што гэта за тэхнікум, калі вось ужо другі год студэнты не вывучаюць спэцыяльных прадметаў па аўтатрактарнай справе. Ні аднаго настаўніка-спэцыяліста, ні аднаго інжынэра, ні аднаго тэхніка тэхнікум ня мае, а завецца тэхнікумам.

1, памаўчаўшы, дадаў:

А дырэктар? Увесь год ён езьдзіць, ды шукае месца, куды перакінуць тэхнікум. Вось і цяпер яго ўжо тыдзень, як няма — сядзіць у Менску. Грошай у тэхнікуме няма ні капейкі. Дырэкцыя нездольна нават прывезьці дроў і студэнты сядзяць у неацепленых памяшканьнях.

Для больш поўнай характарыстыкі становішча тэхнікуму дадамо, што 1.167 рублёў адлічэньняў на пазыку «чацьверты завяршальны» і 1.013 руб. страхавых адлічэньняў расходаваны невядома на што.

І вось у гэту ўстанову, кіраўніком якой месца ў Допры, перадаецца трактарная майстэрня, якая павінна абслугоўваць 17 саўгасаў з сямі раёнаў.

Пасьля ўсяго гэтага зразумела, чаму майстэрня з 61 трактара і 4 аўтамашын, якія яна павінна была адрамантаваць паводле пляну да 1 сакавіка, на 4 лютага адрамантавала ўсяго толькі 11 трактараў. Аб якасьці гэтага рамонту сьведчыць той факт, што тры трактары рамантаваліся два разы паўторна. Трактар саўгасу «Кісьлёўка», нядаўна адрамантаваны, зараз прывезен коньмі назад.

Нам скажуць: няма запасных частак. Дык чаму-ж тады запасныя часткі для майстэрні пралежалі нявыкупленымі з 15 па 26 студзеня? Чаму адміністрацыя не пацікавілася перагляцець груды старых частак, з якіх нмат можна знайсьці яшчэ прыгодных і якія валяюцца ў кучы разам з хламам.

Майстэрня ня мае штодзеннага апэрацыйнага пляну. Работа праходзіць па прыказцы «як бог на душу паложыць». У сярэднім працуюць 7 гадзін, а то і менш. З-за «няўвязак» саўгас не дае электраасьвятленьня. З-за гэтых-жа «няўвязак» перакінутыя на практычную работу 18 студэнтаў тэхнікуму ніяк ня могуць дабіцца, каб іх, як рабочым, давалі ня 300 грам хлеба, а 600, бо дырэктар Цярэшка ўсё яшчэ сядзіць у Менску.

Гэта становішча скарыстоўваюць чужакі, якія пралезьлі ў тэхнікум. Так старшыня прафкому Доўнар агітуе рабочых і студэнтаў-практыкантаў:

— Ня прыбавяць хлеба, ня выходзь це на работу.

І з прычыны поўнай бязьдзейнасьці як саўгаснай, так і тэхнікумаўскай парт'ячэек, яму да некаторай ступені гэта ўдаецца. 1 лютага студэнты не працавалі, астатнія дні гадзіну працуюць, а гадзіну ходзяць.

Як мы ўжо адзначылі, з-за злачынгнай нядбайнасьці кіраўнікоў, майстэрня вельмі слаба абсталявана. Злыя языкі кажуць, што Цярэшка купіў у свайго роднага брата амаль зусім нягодны рухавік. Але, каб не пакрыўдзіць свайго брата, ён заплаціў за рухавік у два разы даражэй, чым каштуе новы.

Майстэрня зусім не абгледжана, вацяняецца. Гакарны варштат папёрты; амаль прышоў у негодную варштат для расточкі цылідраў. Нікуды негодны варштат для наліўкі карэнчных падшыпнікаў і наліўка робіцца ўручную, саматужным спосабам, што замаруджвае работу і вядзе да перарасходваньня дэфіцытнага матар'ялу.

Бачычы такое становішча трактарнай майстэрні і цяперашняга яе гаспадара тэхнікуму, узьнікае пытаньне: дзе-ж былі раённыя арганізацыі? Дзе быў раённы камітэт партыі?

У пастанове ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 29 студзеня аб ходзе рамонту трактараў сказана:

«Забясьпечыць штодзеннае канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва ўсім ходам рамонтнай кампаніі, унікаючы пры гэтым дачы агульных адцяненых дырэктыў».

Ці забясьпечыў РК такое кіраўніцтва? Перад намі дзьве яго пастановы: ад 13 і ад 15 студзеня. Адзначым, што да гэтага часу райком не займаўся майстэрняй. У пастанове ад 13 студзеня, у якой дасьцца згода бюро на перадачу майстэрні аўтатрактарнаму тэхнікуму, сказана:

«Студэнты тэхнікуму ня маюць магчымасьці атрымаць поўнасьцю практычныя навыкі ў рабоце, зьвязаць тэорыю з практыкай... Майстэрня Ўраравіцкага саўгасу, не змагла забясьпечыць поўнасьцю бесьперапынную вытворчую практыку студэнтам Ўраравіцкага аўтатрактарнага тэхнікуму. На аснове гэтага, бюро РК лічыць правільным рашэньне ўпаўнаркамсаўгасаў аб перадачы Ўраравіцкай саўгаснай майстэрні Ўраравіцкаму тэхнікуму».

Праз тры дні на пасяджэньні бюро ад 15 студзеня выносіцца другая пастанова. Прыводзім яе амаль поўнасьцю.

«Улічваючы, што аўтатрактарны тэхнікум знаходзіцца на тэрыторыі саўгасу Ўраравічы, ад якога залежыць увязка тэарытычнай вучобы з прахаджэньнем вытворчай практыкі студэнтаў, а таксама з прычыны адсутнасьці адпаведнай матар'яльнай базы дырэкцыя тэхнікуму нездольна ўзначаліць адміністрацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва, што складае пагрозу як у сэнсе наладжваньня нармальнай вучобы ў тэхнікуме, так і якаснаму і свачасоваму рамонту трактараў (нарэшце і аб рамонце трактараў загаварылі! М. С.), — лічыць мэтазгодным аўтатрактарны тэхнікум падпачаліць непасрэднаму адміністрацыйна-гаспадарчаму кіраўніцтву саўгасу Ўраравічы, усклаўшы на яго поўную адказнасьць за гаспадарчае абслугоўваньне студэнтаў і работу трактарнай майстэрні. Гэта дасьць магчымасьць забясьпечыць павышэньне якасьці тэарытычнай вучобы, нармальнага прахаджэньня студэнтамі вытворчай практыкі, захоўваючы профіль апошніх — рэмонтных мэханікаў — і лепшай работы трактарнай майстэрні. Прасіць упаўнаважанага Наркамсаўгасаў правесьці ў жыцьцё загадам гэта мерапрыемства».

Ня будзем камэнтаваць гэтай доўгай пастановы, ня будзем спрачацца з бюро, ці «з прычыны адсутнасьці адпаведнай матар'яльнай базы дырэкцыя тэхнікуму ня здольна ўзначаліць адміністрацыйна-гаспадарчага кіраўніцтва», ці наадварот, «з прычыны ня здольнасьці дырэкцыі адсутнічае ўсякая матар'яльная база».

Зазначым толькі крайнасьці: то ня аснове вучобы студэнтаў і практыкі майстэрня перадаецца тэхнікуму, то па гэтай-жа аснове майстэрня і сам тэхнікум перадаецца ў поўнае веданьне саўгасу. Ну, а як-жа з ліквідацыяй прарыву ў майстэрні і рамонтам трактараў? Гэта само прыложыцца, напэўна думае бюро.

Такім чынам, бюро само ўзяпалася ў гульню Цярэшкі і Скроба па перакідцы майстэрні з рук у рукі, не забясьпечыўшы «штодзеннага канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва», дапамагаючы аб'ектыўна дэмабілізаваць рабочых і студэнтаў-практыкантаў, працуючых у майстэрні.

Мы лічым, што кіраўніцтва ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў і ЦКК-НКІ БССР павінны зацікавіць гэтай справай і прынесьці ўсіх «спартсмэнаў», якія доўгі час займаліся гульнёй, у майстэрню да належнае фінішу.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Павысіць клясавую пільнасьць на лесазагатоўчым фронце

ЗЛАМАЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ

Сьнег на галаву

Сьнег, выпаўшы каля дэкады назад, устанаўленьне санной дарогі зьявіліся для апартуністаў талачынскіх лесазагатоўчых арганізацый «нанрмемным сюрпрызам». Гэта быў, як кажуць, адкрытны «сьнег на галаву», бо адна-ла апошняя «аб'ектыўная» прычына, апошняя шыльда, за якой гора-заготоўшчыкі прыкрывалі сваю поўную бязьдзейнасьць.

Адсутнасьцю санной дарогі яны тлумачылі ганебны зрыў плану лесавывазкі чацьвертага кварталу мінулага году, гэтай-жа прычынай імкнуліся апраўдаць студзеньскі прарыў.

Але санная дарога ўстанавілася. І што-ж? Тэмпы вывазкі лесу засталіся, як і раней, злачынна нізкімі. Як і раней, на загатоўках і вывазцы працуе ашэрная кольасьць людзей і фурманак. Вось даныя Талачынскага лесграмгасу: на вывазцы замест прымацаваных 4.133 фурманак працавала 30 студзеня 1.215 фурманак, 31-га — 1.429 або 34 проц. Характарна, што гэтыя лічбы работнікі лесграмгасу лічаць ужо дасягненьнем, бо, бачыце, раней працавала яшчэ менш.

Што можна сказаць аб такіх «дасягненьнях», якія прывялі да зрыву студзеньскага заданьня й ставяць пад рэальную пагрозу плян першага кварталу. Толькі безнадзейныя апартуністы, людзі, нязьдольныя змагацца за ажыцьцяўленьне заданьняў партыі і ўраду, могуць гапарыцца такімі посьпехамі.

Такім чынам, факты і лічбы разьбіваюць упэўнэ усялякія спасыланьні на адсутнасьць санной дарогі. Факты і лічбы паказваюць, што справа далёка ня ў гэтым, што загатоўкі і асабліва вывазка лесу зрывалася Талачынскім раёнам як пры адсутнасьці санной дарогі, так і пасьля не ўстанаўленьня.

Між іншым, у Талачыне прыводзяць яшчэ адну прычыну зрыву лесазагатовак. «Бачыце, уся ўвага была накіравана на загатоўку збожжа і ільну, таму лесазагатоўкі адыходзілі на задні плян» — гаворыць там. дырэктара лесграмгасу Кастрыкін (зараз зьняты з работы).

Гэта, бадай, праўда. Замест таго, каб па-бальшавіцку спалучыць усе важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі, талачынскія арганізацыі ўзялі стаўку на «чарговасьць кампаній», парушылі «адпасьці» лесазагатоўкі і вывазку. Нават прэзыдыум РВК у сваёй пастанове ад 5 студзеня 1933 году прымушан быў прызнаць, што ён не аддаваў ніякай увагі загатоўкам і вывазцы лесу.

У рэзультаце лесавывазка сарвана. У чацьвертым квартале мінулага году замест 30 тыс. кбм. лесаматар'ялаў вывезена толькі 8.277 кбм. або 28 проц. заданьня, замест 27.600 кбм. дроў вывезена толькі 2.031 кбм., або 7,3 проц. Уся загатоўленая драўніна засталася ў лесе. Гэта, адпак, не перашкодзіла дырэкцыі лесграмгасу даць вышэйшым органам яўна дутыя весткі аб выкананьні пляну і нават атрымаць прэмію за «ударную» работу.

На пляну першага кварталу бягучага году, зацверджанага прэзыдыумам РВК, Талачынскі лесграмгас павінен загатовіць 37 тыс. кбм. лесаматар'ялаў і 22 тыс. кбм. дроў; вывезці 93 тыс. кбм. лесаматар'ялаў і 58 тыс. кбм. дроў.

Як-жа выконваецца гэты плян?

На 28 студзеня загатоўлена лесаматар'ялу 3.853 кбм. — 10 проц., дроў 1.649 кбм. — 7 проц.; вывезена: лесаматар'ялаў 6.854 кбм. — 7 проц., дроў 3.842 кбм. — 7 проц. Прычым на асобных вучастках процант загатовак і вывазкі яшчэ больш нізкі.

Аспэўны тормаз загатовак і вывазкі — дрэнная вярбоўка рабочай і пітальнай сілы. Большасьць сельсаветаў систэматычна ня выконваюць заданьняў. Напрыклад, па Сакалінскім сельсавеце замест 250 фурманак на працу выяжджае 5-10 фурманак у дзень, па Пакодаўскім замест 300 фурманак—20, па Рыдамскім замест 100 — 4, па Сцуратоўскім замест 170 — 10 і г. д.

У гэтым бязумоўна, віна як сельсаветаў, так і лесграмгасу, які ня здолеў мабілізаваць працоўных мас вёскі на барацьбу за выкананьне пляну лесавывазкі, які наогул не вядзе ніякай растлумачальнай работы вакол гэтай кампаніі.

Як ідзе вярбоўка рабочай сілы па калгасах, дзе работа палягчаецца тым, хам заключэньня адпаведных дагавораў з праўленьнямі? Треба сказаць, што дагаворы заключаны далёка ня ўсюды. Многія калгасы зусім не ахоплены вярбоўкай. Узяць хоць-бы Новасельскі сельсавет. З 9 калгасаў гэтага сельсавету ні з адным не заключан дагавор. Вярбоўшчыкі чамусьці наогул абышлі гэты сельсавет. Ды ці толькі гэты?

Але зьвернемся да калгасаў, з якімі дагаворы заключаны. Як яны выконваюць гэтыя дагаворы? Вельмі дрэнна. Большасьць дагавораў зрываецца. Многія калгасы глядзяць на дагавор з лесграмгасам, як на непатрэбную рэч. Дый у самім лесграмгасе гэтыя дагаворы лічаць пустой фармальнасьцю, не прыдаюць ім ніякага значэньня. Ні кантролю за выкананьнем дагавораў, ні напамінкаў калгасам ніхто ня робіць. **Аб прыцягненьні да судовай адказнасьці за злосны сабатаж лесавыва зак ніхто і ня думае.** Што-ж дзіўнага, што дагаворы ператварыліся ў простыя, нікому непатрэбныя кавалкі паперы?

Многія калгасы ўжо атрымалі наперад зд лесграмгасу палозьі абалы, жа... розныя ператвары... дагавораў ня выконваюць.

І імкнна такім калгасам лесграмгас чамусьці даверліва адпускае матар'ялы і прамтавары. «У парадку тавэрыскай паслугі», — як казка былы там. дырэктара Кастрыкін.

Кладвароч, калгасы, якія добрасумленна выконвалі і выконваюць дагаворы, часта нічога не атрымліваюць.

***

Чае ўсё-ж аспэўная прычына зрыву вытворчага пляну лесграмгасу? У чым корань зла? Справа ў самім апараце лесграмгасу, у апараце вучасткаў. Чужыя, антысавецкія элемэнты, пралезшыя ў лесазагатоўчы апарат, развалваюць яго работу, шкодзяць, зрываюць мерапрыемствы партыі і ўраду. П'янства, разлажэньне, растраты шырокае смаснабжэньне, — усё гэта сыстэматызавалася, стала мэтадам работы лесграмгасу і яго вучасткаў. Дырэктар лесграмгасу Грабоўскі (зараз зьняты з работы) ня здолеў спаскорыць выкрыць і выгнаць з апарату шкодніка, п'яніц, растратчыкаў і самапасаджэнцаў накшталт нам. дырэктара Кастрыкіна, лесавода Мальчыкова, прарыба Шыпулі, загатчыка абозу Андрыеўскага. На кватэры ў Шыпулі налічваліся п'янкі, у якіх прымаў удзел увесь гэты «букет». У п'яным угары сьпяваліся контр-рэвалюцыйныя песьні, рабіліся ўмовы на розныя злачынныя здзелкі.

Лесрабкоп ператварыўся фактычна ў гняздо самаснабжэнцаў. Тут ня лічылі ні з чым. Прадукты і прамтавары выдаваліся па любой асабістай запісцы «свайго чалавека». Вось вынікі «дзейнасьці» лесрабкопу за кароткі час: замест 30 тон хлеба, вызначаных нормамі снабжэньня, лесрабкоп выдатка ваў 142 тоны, аўса замест 190 тон выдатка ваў 254 тоны, круп замест 6 тон — 43 тоны і г. д. На чале лесрабкопу доўгі час стаяў яўны шкодник і растратчык Храмой. У жніўні ён быў зьняты з работы, але на яго месца трапіў ня менш «актыўны» самаснабжэнец Пучкоў. Злачынная безгаспадарчасьць «кіраўнікоў» лесрабкопу прывяла да таго, што на палёх згніло 200 пудоў бульбы і 200 пудоў капусты. Трусагадоўчая гаспадарка лесрабкопу развалілася, трусы падохлі з-за адсутнасьці догляду.

Раённыя арганізацыі не аддавалі на лежнай увагі работе лесграмгасу, ня прымалі своячасовых мер для аздараўленьня лесазагатоўчага апарату.

У раённай пракуратуры справа аб злоўжываньнях у лесграмгасе і лесрабкопе, перададзная туды райКК-РСІ, пралежала звыш 5 месяцаў. Гэта называецца «хуткае разгаваньне»!..

Партыйныя і савецкія арганізацыі Талачынчыны абавязаны неадкладна забясьпечыць карэнны пералом у леса вывазцы, мабілізаваць вакол гэтай кампаніі ўвагу шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў раёну.

Выязная рэдакцыя «Зьвязды»
Б. Папоў, С. Галкін.

Выгнаць з вучлесгасу кулака Астроўскага

Загатоўка і вывазка лесу па Даўжанскім сельсавеце, Віцебскага раёну, ідзе вусім дрэнна. Рад калгасаў зусім не ўяўлі сабе важнасьці лесазагатовак і вывазкі. Члены сельсавету бязьдзейнічаюць. Бюро партыйнай ячэйкі сельсавету не ўсначаліла справы лесавывазкі і не згуртавала вакол сабе актыву калгаснікаў. Аб гэтым сьведчаць факты.

Калгас «Шлях Ільліча», які павінен загатовіць і вывезці 650 кбм. дроў, загатовіў толькі 50 кбм. і ня вывез ні аднаго. Калгасы «Шлях Ільліча», «Новы шлях» і «Інтэрнацыянал» павінны кожны дзень даваць 15—20 фурманак, але з першых двух калгасаў штодзенна выяжджае ў лес толькі 5—6 фурманак, а з калгасу «Інтэрнацыянал» — 2—3.

Аднаасобны сэктар фактычна не прыступіў да выкананьня пляну лесавывазкі. Па ўсім сельсавеце з аднаасобнага сэктару выяжджаюць толькі 3—4 фурманкі.

Ні цікавіцца справай лесазагатовак і вучастак лесграмгасу, які знаходзіцца на тэрыторыі сельсавету. Працаўнікі вучастку не палічылі патрэбным нават зьявіцца на пленум сельсавету, дзе стаяла гэта пытаньне. У вучастак пралезьлі былыя кулакі, якіх прыкрывае загатчык вучастку Лабуцкі. У яго на прыёмачным складзе працуе кулак Астроўскі, які вычынчае в калгасу «Новы шлях» за разлагаючую работу. Сваю дзейнасьць Астроўскі працягвае і ва ўчастку. Пры прыёме лесаматар'ялу ён заўсёды зьмяншае яго колькасьць.

Прэзыдыум Даўжанскага сельсавету вынес пастанову аб зьнятьці з работы кулака Астроўскага, але апошні і па сёняшні дзень працуе ў лесграмгасе.

Мялешка.

Яны спадзяваліся на самацёк...

Уланаўскі сельсавет, Шклоўскага раёну, мае ўсе магчымасьці для дагаворнага выкананьня пляну лесавывазкі першага кварталу. Вывезьці 1.000 кбм. будаўнічага матар'ялу і столькі-ж дроў пры наяўнасьці 313 працоўных коняй—вядомае зусім рэальнае. Але да 19 студзеня лесавывазка па сельсавеце амаль ня была пачата.

«Няма калі вазіць лес, мы заняты зараз іншымі больш важнымі кампаніямі» —такія словы можна было пачуць ад работнікаў сельскага савету. Лесавывазка ў сельсавеце лічылася другараднай справай. Сельсавет ня ведаў становішча з лесавывазкай, не сачыў за выкананьнем цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі. Уланаўцы спадзяваліся, што перамога на фронце лесавывазкі прыдзе самацёкам.

19 студзеня ва Уланаўскі сельсавет прыехала буксірная брыгада, якая правяла вялікую работу па выкананьні пляну лесавывазкі. У выніку работы буксірнай брыгады аднаасобнікі в. Лотва 21 студзеня арганізавана выехалі ў лес і вывезьлі 40 кбм. лесаматар'ялаў. 22 студзеня з гэтай вёскі выехала ў лес 37 фурманак.

Значна павысіўся ўдзел у лесавывазцы і калгаснага сэктару. Калгас імя Калініна са 160 кбм., якія ён павінен вывезьці ў першым квартале, вывез ужо 100 кбм. Старшыня калгасу «Чырвоны Настрычнік»—Кірылаў Кузьма, у выніку правільнай расстаноўкі рабочай сілы змог ілучыць спэцыяльную брыгаду калгаснікаў на лесавывазку. Брыгада штодзенна выяжджае ў лес і на 25 студзеня выканала плян вывазкі першага кварталу на 45 проц.

Не застаўся ў баку ад гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі і калгас «Пэўны шлях», які заключыў з лесграмгасам дагавор на вывазку 150 кбм. будаўнічага матар'ялу, абавязаўся выканаць плян дагаворнова і выклікаў на спаборніцтва калгас імя Карла Маркса. У калгасе «Пэўны шлях» створана брыгада лесарубаў, якая штодзенна працуе ў лесе.

Такім чынам, з 20 студзеня па сельсавеце выяжджае ў лес ня менш 100 фурманак. Вынікі пяцідзеньскі бальшавіцкага змаганьня далі магчымасьць сельсавету наблізіцца да выкананьня пляну лесавывазкі. Замацаваць зрух, біцца за кожны процант—баявая задача калгасаў і сельсавету.

Каласоўскі.

Аб зьменах у складзе парткіраўніцтва на Украіне

ХАРКАЎ, 3. Гэтымі днямі адбыліся пленумы ЦК КП(б)У, а таксама Харкаўскага, Днепрапятроўскага і Адэскага абкомаў КП(б)У. Пленумы заслухалі паведамленьні аб пастанове ЦК УсеКП(б), у якой гаворыцца, што партарганізацыі Украіны ня спраўліся з ускладненай на іх партыяй задачай арганізацыі збожжазагатовак і ўмацаваньня калгасаў і што асноўнымі абласьцямі, работу якіх трэба перш за ўсё палепшыць, зьяўляюцца Адэская, Днепрапятроўская і Харкаўская вобласьці.

Пасьля спрэчак па заслуханых паведамленьнях, крытыкі дапушчаных украінскімі арганізацыямі памылак, пленумы цалкам і поўнасьцю ўхвалілі пастанову ЦК УсеКП(б) і зрабілі з яе наступныя арганізацыйныя вывады.

Пленум ЦК КП(б)У выбраў сакратара ЦК УсеКП(б) тав. П. Постышава члена Палітбюро і Аргбюро ЦК КП(б)У і другім сакратаром ЦК КП(б)У, вызваліўшы ад пасады другога сакратара ЦК КП(б)У т. Хатаевіча, з прычыны яго пераходу на другую работу, але залаваўшы за тав. Хатаевічам пост сакратара ЦК КП(б)У.

Аб'яднаны пленум Харкаўскага абкому і гаркому КП(б)У выбраў сакратара ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)У тав. П. Постышава першым сакратаром Харкаўскага абкому і гаркому КП(б)У, вызваліўшы ад гэтай пасады т. Церахава, адкліканага ў распараджэньне ЦК УсеКП(б).

Пленум Днепрапятроўскага абкому КП(б)У выбраў сакратара ЦК КП(б)У т. М. Хатаевіча першым сакратаром Днепрапятроўскага абкому КП(б)У, вызваліўшы ад гэтай пасады т. Строгановa, адкліканага ў распараджэньне ЦК УсеКП(б).

Пленум Адэскага абкому КП(б)У выбраў был. сакратара Крымскага абкому УсеКП(б) т. Вэгера першым сакратаром Адэскага абкому КП(б)У, вызваліўшы ад гэтай пасады т. Маёрава, адкліканага ў распараджэньне ЦК УсеКП(б).

Пленум Днепрапятроўскага абкому КП(б)У

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 7. Пашыраны пленум Днепрапятроўскага абкому КП(б)У з удзелам сакратароў райкомаў і абл. актыву абмеркаваў даклад сакратара ЦК КП(б)У тав. Хатаевіча аб становішчы збожжазагатовак і падрыхтоўкі да сяўбы на Украіне.

Пленум па-бальшавіцку ацаніў пастанову ЦК УсеКП(б), поўнасьцю ўхваліў яе, прызнаўшы, што Днепрапятроўская партарганізацыя ня спраўлялася з пастаўленымі перад ёю задачамі ў галоўнасьці выкананьня пляну збожжазагатовак і падрыхтоўкі да сяўбы. Пленум абавязаў усю партарганізацыю мабілізаваць калгасныя масы і рабочых саўгасаў вакол пастановы студзеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і прамовы тав. Сталіна «аб рабоце ў вёсцы».

Пленум выбраў замест адкліканага ў распараджэньне ЦК УсеКП(б) т. Опрышкова першым сакратаром Днепрапятроўскага абкому КП(б)У сакратара ЦК КП(б)У тав. Хатаевіча, увёўшы яго ў склад пленуму і бюро. Трэцім сакратаром пленум выбраў тав. Грыгор'ева. У склад пленуму і бюро ўведзен таксама новы сакратар абкому ЛКСМУ т. Месьпенкаў (замест выбыўшага т. Чэрвака).

Пленум вывеў са складу абкому былога сакратара Паўднаўраднага РПК Деброва, які быў зняты з работы, як неаправдаўшы давер'я партыі.

Пленум Адэскага абкому КП(б)У

АДЭСА, 7. Пленум Адэскага абкому КП(б)У заслухаў і абмеркаваў даклад сакратара ЦК УсеКП(б) тав. Постышава аб ходзе выкананьня пляну збожжазагатовак партарганізацыяй Украіны, у тым ліку Адэскай вобласьці, аб барацьбе за выкананьне гэтага пляну Адэскай партарганізацыяй і аб пастанове ЦК УсеКП(б) ад 24 студзеня б. г. па ўмацаваньні партарганізацыі Украіны.

У рэзалюцыі пленум прызнаў зусім правільнай ацэнку, даную ў пастанове ЦК УсеКП(б) ад 24 студзеня 1933 г. аб тым, што партарганізацыя Украіны, у тым ліку партарганізацыя Адэскай вобласьці — адной з фашызуючых сельска-гаспадарчых абласьцей Украіны — ня справілася з ускладненымі на іх партыяй задачамі ў справе арганізацыі збожжазагатовак і выкананьня пляну ўдачы збожжа дзяржаве. Пленум поўнасьцю ўхваліў мерапрыемствы ЦК УсеКП(б) па ўмацаваньні ЦК КП(б)У, а таксама кіраўніцтва Харкаўскай, Адэскай і Днепрапятроўскай абласьцей.

***

СІМФЭРОПАЛЬ, 4. Учора адбыўся пленум абласнога камітэту партыі. Пленум заслухаў і абгаварыў даклад аб падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі і разгледзеў арганізацыйныя пытаньні. Замест т. Вэгера, выбранага першым сакратаром адэскага абкому, пленум выбраў першым сакратаром крымскага абкому т. Сямёнава, працаваўшага ў апошні час другім сакратаром сярэднеазіяцкага бюро ЦК УсеКП(б) (Роста).

РАБОЧЫЯ МЕНСКУ РЫХТУЮЦЬ БАЯВУЮ СУСТРЭЧУ ЎСЕСАЮЗНАМУ ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ-УДАРНІКАЎ

Падхапіць добры пачын

У сувязі з падрыхтоўкай да ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, на прадпрыемствах Менску разгарнулася шырокая работа па ўзмацненьні шэфства над вёскай.

На радзе прадпрыемстваў адбыліся сходы рабочых, на якіх узяты канкрэтныя самаабавязацельствы па дапамозе падшэфным калгасам у падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Сёньня мы друкуем пастановы двух прадпрыемстваў з канкрэтнымі самаабавязацельствамі (абутковая фабрыка імя Кагановіча і кандытарская фабрыка «Камунарка»).

Такія-ж пастановы вынесены на швэйкай фабрыцы «КАСТРЫЧНІК» і іншых прадпрыемствах Менску. Астатнія прадпрыемствы БССР павінны пасьледаваць прыкладу пралетараў Менску і разгарнуць канкрэтную работу па дапамозе падшэфным калгасам у падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Прынялі выклік і абавязаліся

Агульны сход рабочых, работнікаў, служачых і ІТР фабрыкі «Камунарка», заслухаўшы інфармацыю пра скліканьне ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, вітае пастанову ЦК УсеКП(б) аб скліканьні гэтага зьезду і ўпэўнен, што зьезд, узброіўшыся гаспарчымі пастановамі апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) і ўказаньнямі правадыра партыі тав. Сталіна, паменіць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні задач народна-гаспадарчага пляну, у прыватнасьці, аб павышэньні ўраджайнасьці і арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Мы прымаем выклік перадавых прадпрыемстваў Менску—друкарні імя Сталіна і заводу імя Молатава—аб узмацненьні шэфства над вёскай і абавязваемся правесьці наступнае:

Выслаць брыгаду ў складзе пяці асоб у Бераўскі падшэфны сельсавет для дапамогі калгасам у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, мабілізаваць на пастаянную работу ў падшэфны сельсавет аднаго рабочага. Арганізаваць брыгаду для дапамогі калгасам імя Самарскай дывізіі і 3 казкорпуса ў рамонце сельска-гаспадарчага інвэнтару.

Рэдкалегія шматтыражкі фабрыкі абавязалася арганізаваць выезд рабкораўскай брыгады для арганізацыі выпуску друкаванага бюлетэню, прысьвечанага падрыхтоўцы да сяўбы.

Сход упэўнен, што пад кіраўніцтвам фабрычнай партарганізацыі падшэфны сельсавет, пры дапамозе рабочага калектыву фабрыкі, па-баявому падрыхтуецца і правядзе чацьвертую бальшавіцкую вясну.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б), на чале з правадыром партыі тав. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б, на чале з лепшым бальшавіком тав. Гікало!

Высылаюць брыгаду для рамонту с.-г. інвэнтару

Заслухаўшы інфармацыю аб скліканьні ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, агульны сход рабочых, служачых і ІТР менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча горача вітае пастанову партыі аб скліканьні гэтага зьезду і ўпэўнен, што ён вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні пастаноў студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і сэсіі ЦВК СССР аб далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і павышэньні ўраджайнасьці сацыялістычных палёў.

У мэтах узмацненьня шэфскай работы над вёскай і дапамогі падшэфным калгасам у падрыхтоўцы да чацьвертага бальшавіцкага вясны, агульны сход абавязаўся ў трохдзённы тэрмін выслаць у падшэфны сельсавет брыгаду для рамонту калгаснага сельска-гаспадарчага інвэнтару. Апрача гэтага сход выдзеліў канкрэтныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі ў гаспадарцы фабрыкі.

Рабочы калектыў фабрыкі ўпэўнен у тым, што калгасы БССР, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з лепшым бальшавіком тав. Гікало, з посьпехам падрыхтуюцца да пасеўнай кампаніі і па-баявому правядуць яе.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б) на чале з правадыром сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным!

Выбірайце лепшых!

СТАРОБІН. (Па тэлеграфу). Раённы зьлёт ударнікаў-калгаснікаў выбраў дэлегатам на ўсесаюзны зьезд ударнікаў-калгаснікаў тав. Бялько Міколу Іванавіча, бедняка-калгасьніка, кандыдата партыі, члена праўленьня калгасу і брыгадзіра за актыўны ўдзел у загатоўках. Тав. Бялько прамініваны.

Аб разбазарваньні і раскрадваньні дырэктарам Белшвэйзбыту прамтавараў, п ызначаных для забесьпячэньня рабочых-ударнікаў

Пастанова аб'яднанага пасяджэньня прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і прэзыдыуму ЦСПСБ

Партыя і ўрад вызначылі і праводзяць рад важнейшых мерапрыемстваў па ўсямерным паляпшэньні забесьпячэньня рабочых. Аб гэтых мерапрыемствах і посьпехах, якіх ёсьць у гэтым напрамку, ведае ўся рабочая клясса СССР. Справу ўсямернага паляпшэньня рабочага забесьпячэньня партыя паставіла як адну з важнейшых палітычных задач на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, патрабуючы ад кожнага камуніста, ад кожнага працоўнага актыўнай барацьбы за выкананьне гэтай пачэснай задачы.

Клясавы вораг, аказваючы шалёнае супраціўленьне мерапрыемствам партыі на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, выкарыстоўваючы непыстарчальную клясавую пільнасьць, безгаспадарчасьць і расхлябанасьць у асобных зьвеньнях нашага апарату, праз сваю агентуру—апартуністаў, буржуазных перадаўжэнцаў, зладзеяў, кулакоў з партбілетамі ў кішэні,— усімі спосабамі імкнецца падарваць і дыскрэдытаваць у вачох працоўных палітыку і практычныя мерапрыемствы, якія праводзяцца партыяй і савецкім урадам.

Выкрытыя ЦКК РСІ злачынствы ў апараце Белшвэйзбыту зьяўляюцца выразным прыкладам таго шкодніцтва, якое робіць клясавы вораг у справе падрыву рабочага забесьпячэньня, калі клясавая пільнасьць у пасобных праф. і партъвеньнях невыстарчальна мабілізавана і гаспадарчая справа вядзецца без належнага ўліку і кантролю.

Лічыць устаноўленым:

1. Што дырэктар Белканторы Швэйзбыту, былы загатчык забесьпячэньня Белшвэйаб'яднаньня, Шэйман, выкарыстоўваючы сваю злачынную сувязь з былым загатчыкам магазыну Бухманам, праз спэцыяльна арганізаваны магазын для ўдарнікаў прадпрыемстваў, ня маючы ЗРК, систэматычна разбазарваў і раскрадваў дзяржаўныя прамтаварныя фонды, прызначаныя для рабочых ударнікаў, шляхам выдачы за пісак, тэлефонных і інш. распараджэньняў на водпуск тавараў асобам-і ўстановам, ня маючым ніякіх адносін да рабочых ударнікаў; з мэтай захаваньня сьлядоў злачынства, пэрыядычна патрабаваў ад работнікаў магазыну зваротку выданых ім запісак і зьнішчаў іх, заблытаючы ўсякую справаздачасьць па водпуску тавараў. У выніку гэтага на пацяту 13 месяцаў рабочыя ўдарнікі недатрымалі прызначаных ім прамтаварных фондаў на суму каля 200 тыс. руб.

2. Прэзыдыум ЦКК і прэзыдыум ЦСПСБ адзначаюць, што прафарганізацыі—Менгарпрафсавет, ЦП саюзу швэйнікаў і гарком прфсаюзу кааперацыі і гандлю—не ўзьнялі яшчэ сваёй работы на вышыню салчых перад прафсаюзамі задач, з іх оку ня была аддана неабходная ўвага цэнтральнаму пытаньню рабочага забесьпячэньня і пераважнага забесьпячэньня ўдарнікаў, ажыцьцяўленьня жорсткага кантролю над работай гаспадачага, кааперацыйнага апарату і асткі яго ад жулікаў, зладзеяў, якія раскрадаюць дзяржаўную маемасьць.

Гэта вынікае з таго, што работе гэтых прафарганізацый перважвае яшчэ параднасьць, замест канкрэтнага кіраваньня і пастаяных шэфсенных клопатаў аб патрэбах рабочае клясы. Таму злачынствы ў Белшвэйзбыце доўгі час заставаліся ня выкрытымі.

3. Разам з гэтым прэзыдыум ЦКК і прэзыдыум ЦСПСБ адзначаюць, што ўсе работнікі прылаўку магазыну № 1 Швэйзбыту вялі слабе недастойна званая прафсаюзу, не праявілі неабходнай грамадзянскай мужнасьці, аб выкрыць у самым пачатку незаконныя дзеяньні дырэктара Белшвэйзбыту і загатчыка магазыну і, такім чынам, спрыялі раскрадваньню таварных фондаў.

Прэзыдыум ЦКК і ЦСПСБ пастанаўляюць:

1) Абвясьціць вымову фракцыі Менгарпрафсавету, ЦП саюзу швэйнікаў і гаркому прафсаюзу гандлю і кааперацыі, якія не забясьпечылі давядзеньня фондаў рабочага забесьпячэньня на прызначэньні і не арганізавалі кантролю саміх ударнікаў, прымацаваных да магазыну, за дзейнасьцю работнікаў магазыну і ўліку водпуску прамтавараў сапраўдным рабочым ударнікам.

Даручыць Менгарпрафсавету абгаварыць пытаньне наконт таго, каб пакінуць надалей на прафсаюзнай рабоце работнікаў сацбытавога сэктару гарпрафсавету.

Менгарпрафсавету, ЦП саюзу швэйнікаў і гаркому прафсаюзу работнікаў кааперацыі і гандлю забясьпечыць шырокае абгаварэньне данай пастановы на прадпрыемствах прамысловасьці і гандлю, мабілізуючы рабочых і работнікаў прылаўку на актыўную барацьбу са спробамі клясава-варожых элемэнтаў шкодніцкай дзейнасьцю падарваць палітыку партыі па ўсямерным паляпшэньні забесьпячэньня рабочых.

2) Даручыць усім гар. райКК-РСІ і гаррайпрафсаветам прамысловых раёнаў прапрацаваць гэту пастанову на сходах рабочых прадпрыемстваў, працаўнікоў прылаўку і арганізаваць масавую праверку правільнасьці ўліку водпуску тавараў і таварных фондаў, прызначаных для снабжэньня рабочых і асабліва ўдарнікаў, забясьпечыўшы ў далейшым наладжаны ўлік і рабочы кантроль за выдаткаваньнем фондаў рабочага забесьпячэньня.

3. Пастанову апублікаваць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Б — Нарком РСІ БССР ЛЫЧОЎ.
Старшыня ЦСПСБ КАВАЛЬЧУК.

ПА СПРАВЕ ШЭЙМАНА І БУХМАНА

Пастанова прэзыдыуму Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б

1. Дырэктара Белканторы Саюзшвэйзбыту Шэймана, рабочага, члена КП(б)Б з 1924 г., які канчаткова перарадзіўся як пралетары і камунист, стаў на шлях злачынства, раскрадаў дзяржаўныя прамтаварныя фонды, прызначаныя для рабочых ударнікаў, і да канца расьсьледваньня адмаўляў свае злачынствы, ашукваючы ЦКК,—выключыць з радоў партыі і аддаць пад суд.

2. Былога загатчыка магазыну, зараз нам. дырэктара фабрыкі «Кастрычнік» па забесьпячэньні—Бухмана, рабочага, члена КП(б)Б з 1927 году, як удзельніка і дапаможніка ў раскрадваньні дзяржаўных прамтаварных фондаў, не жадаючага выкрыць злачынствы да канца, нават і тады, калі быў выкліканы у ЦКК КП(б)Б,—з партыі выключыць і аддаць пад суд.

3. Улічваючы палітычнае значэньне гэтай справы, паколькі выкрытая злачынная дзейнасьць была накіравана на зрыў мерапрыемстваў партыі па паляпшэньні рабочага забесьпячэньня, у першую чаргу ўдарнікаў,—прапанаваць Наркамюсту паскорыць ход сьледзтва і забясьпечыць пастаноўку гэтай справы паказальным працэсам.

4. Даручыць судова-сьледчым органам найбольш злосных кіраўнікоў установаў і асоб, якія незаконна патрабавалі ад швэйзбыту водпуску ім тавараў і расходвалі іх не для рабочых ударнікаў,—прыцягнуць да судовай адказнасьці.

Папярэдзіць кіраўнікоў установаў, аддзелаў, арганізацый, што за незаконныя патрабаваньні аб водпуску тавараў ад гаспадарчых органаў—яны будуць прыцягвацца да адказнасьці побач з простымі раскрадвальнікамі.

5. Даручыць МенгарКК-РСІ разам з Менгаркомам КП(б)Б праверыць работу партыйнай ячэйкі Швэйзбыту і зрабіць адпаведныя вывады з гэтай справы.

Гаркому камсамолу такія-ж мерапрыемствы зрабіць у адносінах ячэйкі КСМ.

Старшыня ЦКК КП(б)Б ЛЫЧОЎ.

Прагульшчыкі спакойна жывуць у заводзкіх кватэрах

На заводзе імя Молатава для праверкі работы заўкому арганізаваны 24 самаправераўчыя брыгады. Прыведзен рад падрыхтоўчых сходаў, заслуханы справаздачны даклад фабкому на пасяджэньні парткалектыву. На цэхавых партячэйках заслухоўваліся інфармацыі цэхавых камітэтаў.

Але, ня гледзячы на ўсю растлумачальную работу, слаба вядзецца канкрэтны агляд работы цэхавых камітэтаў. У лесцэху дагэтуль яшчэ не праведзена справаздача цэхкамітэту. Сарвалася справаздача заўкому ў сьлясарным цэху. Треба адзначыць ганебнае адставаньне чырвонасьцяжнага лесапільнага цэху ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі і хаця гэты цэх узялі на грамадзкі буксір, ён усё-ж адстае.

Барацьба за правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК партыі аб прагулах, за паляпшэньне рабочага снабжэньня, павышэньне прадукцыйнасьці працы —вось асноўныя задачы, вакол якіх павінна разгортацца справаздачна-перавыбарчая кампанія. Як, з гэтым спорыўся трыкутнік заводу імя Молатава? Зьверняемся да руху работы. За апошнія тры месяцы прынята 189 чал., а звольнена 138. У лік прыходу рабочых на работу паступае зусім дрэнна. У цэхах ёсьць 13 вучотчыкаў, якія павінны штодзенна даваць весткі аб нявыхадзе на работу двум спэцыяльным прапаўшчыкам заводакіраўніцтва. Але зводку аб прагулах дастаць цяжка.

Працаўнік, які вядзе ўлік, ня ведае, ад каго яму патрабаваць весткі. Ня дзіва, што ўлік так дрэнна наладжан. У зводках аб прагульшчыках, у графе прычыны прагулаў» супроць імат пра зьвішчаў рабочых зьзяе «тарычэлевая пустата». Ні дырэктар, ні працаўнікі ўліку не паклапаціліся даведацца, па якой прычыне рабочы не зьявіўся на работу. Дырэктар толькі ў прысутнасьці нас праглядзеў зводку аб прагулах за 20 дзён студзеня. Да гэтага часу ён ня меў магчымасьці зьвярнуць увагу на такое важнае пытаньне.

Пару слоў аб рэпрэсыўных мерапрыемствах. Дырэктар, як гэта не анэкдатычна, аб звольненых прагульшчыках даведваецца ад... вучотчыка. У прысутнасьці нас, дырэктар, шырока разводзячы рукамі, пытаўся ў старшыні заўкому і вучотчыка: «Дайце мне прычыны прагулаў і я буду звальняць». Дырэктар, як правіла, даведваецца аб прагулах праз 6—8, а то і больш дзён. Прагульшчыкі і дзяжурнасьцяжатары вытворчасьці, адчуваючы такую спрыяючую глебу, расьпіраліся ва ўсю. Прагульшчыкі (Пятушкоў, Данілаў, Астрахаў і шмат іншых) прагулялі па 2—3, а то і больш дзён, а адміністрацыя іх не звальняе. Ворагі вытворчасьці, якія кінулі завод (Данілаў, Кузьмінкоў, Чарток і шмат іншых), спакойна жывуць у заводзкіх кватэрах. Пад графікам «Невядомым прычыны» красуюцца прозьвішчы прагульшчыкаў Запатылака і Законадаева, а адміністрацыя не адважваецца іх зволіць. «Бо, падумайце, можа яны хварэюць». Так «праводзіцца» ў жыцьцё пастанова ЦК аб барацьбе з прагульшчыкамі. Парткалектыў у асобе сакратара, замест канкрэтнай дапамогі адміністрацыі, замест мабілізацыі мас на рэалізацыю пастановы ЦК партыі аб прагулах, — прыкрыв

КАНЧАТКОВАЯ ЛІКВІДАЦЫЯ ДАПАМОГІ БЕСПРАЦОЎНЫМ У ПОЛЬШЧЫ

Замест дапамогі--„працоўныя батальёны“

ВАРШАВА, 6. (ТАСС). Разгляд праекту законапраекта на бягучых сесіях польскага сойму і сэнату вядзецца ў выключна спешным парадку. Дэпутаты ўрадавага блёку, якія складаюць большасьць сойму, прымаюць усе ўрадавыя прапановы. Урад перапыніў працы сесіі на цяперашняй соймавай сесіі на толькі праект бюджэту на 1933-1934 г., але і рад „законапраектаў“ аб барацьбе з рэзультатамі крызісу і беспрацоўя.

Урадавы блёк уніс на абмеркаваньне сойму праект закону аб стварэньні так званага **«фонду працы»**. Пад выглядам арганізацыі прымацкіх работ у шырокім маштабе законапраект прадугледжвае ўведзеньне **новага ўсегульнага падатку і стварэньне так званых «працоўных батальёнаў»**. Па сэнсе законапраекту арганізацыя «фонду працы» паспіна навесці да ліквідацыі створанага некалькі месяцаў таму назад так званага «фонду дапамогі беспрацоўным». З прычыны катастрафічнага фінансавага становішча, улада, як відаць, намерана зусім ліквідаваць «фонд дапамогі беспрацоўным». Стварэньне «фонду працы» матывуецца необходнасьцю ліквідаваць дапамогу беспрацоўным, якая носіць спажывецкі характар. Законапраект прадугледжвае наступныя крыніцы стварэньня «фонду працы».

1. **Усегульны падатак у разьмеры аднаго процанту заработку работнікаў фізычнай і разумовай працы.**

2. Узносы, якія спаганяюцца гарадскімі муніцыпалітэтамі (1 проц. ад усёй сумы бюджэту і з вясковых абшчын).

3. Некаторыя адлічэньні ад фрэду укосных падаткаў — піва, электрычныя лямпачкі і інш., з кватэрнай платы і г. д. Сёньняшняя газэта «АБЦ» піша аб вялікіх плянах стварэньня працоўных батальёнаў з беспрацоўных. «У бліжэйшы час, — піша газэта, — **пад камандай унтэр-офіцэраў** пачнецца арганізацыя атрадаў з беспрацоўных, былых ваенных рэзервістаў. **У атрадах будзе ўведзена ваенная дысцыпліна.** З гэтай мэтай улада мяркуе стварыць сакоры рэзервістаў, якія будуць асноўным ядром у арганізаваных «працоўных батальёнах». Рабочыя батальёны ў Польшчы будуць створаны па узору пілсудзкіх арганізацый у Германіі і будуць знаходзіцца на становішчы вайсковаабавязаных. Штодзённы заработак у «працоўных батальёнах» будзе складаць 3 злотых. З гэтай сумы будуць зроблены адлічэньні за памяшканьне і харчы, якія атрымліваюцца ў якасьці салдацкага пайка».

„Бэрлінэр Бэрзэн Цэйтунг“ аб пэрспэктывах германскай замежнай палітыкі

БЭРЛІН, 5. Абгаворваючы пытаньне аб замежна палітычным значэньні прыходу да ўлады Гітлера, блізкая да ўраду **«Бэрлінэр Бэрзэн Цэйтунг»** піша: «Стварэньнем нацыянальнага ўраду ў замежна палітычнай галіне перш за ўсё дасягнута тое, што чужаземныя дзяржавы прымуцяны ў сферы замежнай палітыцы лічыцца з наяўнасьцю германскага ўраду. Затраніцай, у прыватнасьці ва Францыі, ужо нельга будзе скарыстаць унутраных непаладзей Германіі і спасылацца на тое, што буйны нацыянал-сацыялістскі рух ня здольны весьці дзяржаўную замежнай палітыку. Зараз і Парыж прымушан весьці перагаворы з Гітлерам, як роўны з роўным. Можна таксама спадзявацца, што цяперашні габінэт будзе весьці моцную, свабодную ад іншай замежную палітыку. Расстаноўка палітых эўрапейскіх дзяржаў яснай. Група дзяржаў, якія арыентуюцца на Францыю, па-ранейшаму варожа выступае супроць Германіі. Англія, зайнятая ўсходня-азіяцкімі і другімі пытаньнямі, займае чакальную пазыцыю».

Сьцьвярджаючы, што СССР прабуе захаваць з Германіяй добрыя адносіны, газэта далей піша: «Пазыцыя Італіі ў адносінах да нас такая, што калі мы гатовы будзем пашырыць нашы перагаворы таксама і на эканамічную вобласьць, мы зможам дасягнуць цеснага супрацоўніцтва з ёю ва ўсіх палітычных пытаньнях. Пры ўмове поўнага адмаўленьня ад утапічных надзей на больш цесную германска-французскую згоду, павінны быць захаваны добрыя зносіны з СССР і пагрыблены прыяцельскія адносіны з Італіяй. Калі гэта адбудзецца, то нашы адносіны з Англіяй, па зразумелых прычынах, набудуць такія формы, якімі яны павінны былі быць заўсёды. А тады мы сапраўды выйдзем са становішча безнадзейнай ізаляцыі, перамаганьне якой павінна зьявіцца першым крокам германскай палітыкі нацыянальнага аб'яднаньня».

90 тысяч студэнтаў Германіі ня маюць шансаў на атрыманьне працы

ВЫЛЬНЯ. На старонках буржуазнай прэсы ўсё часьцей зьяўляюцца заметкі аб перапрадукцыі навуковых сіл у капіталістычных краінах.

Як падае «Дзеньнік віленскі», выпускныя навучальныя ўстановы ў Германіі ў 1931 г. палічвалі 140 тыс. студэнтаў. З гэтай колькасьці толькі 50 тыс. можа спадзявацца на атрыманьне чысьцей-небудзь працы па скончаным курсе.

У краіне існуе 300 тыс. пасад, заняцьце якіх патрабуе ўнівэрсытэцкага дыплёму. Прыпускаючы, што кожная пасада займаецца ў сярэднім праз 33 гады, атрымаем толькі 10.000 вольных пасад кожны год.

Лічачы ў сярэднім па 5 год навучаньня, прыходзім да высноваў, што 50 тыс. студэнтаў выстарчальна для існуючай працы. З гэтага вынікае, што у сучасны момант у Германіі **90 тыс. студэнтаў, для якіх ня існуе ніякіх шансаў на атрыманьне работы па спэцыяльнасьці, па скончэньні унівэрсытэту.** Лік беспрацоўных спэцыялістаў з дыплёмам у кшэні ўзрастае з году ў год, папаўняючы і да таго вялізарную армію беспрацоўных.

„Тан“ у трывозе

ПАРЫЖ, 5. Параўноўваючы ўмовы прыходу Гітлера да ўлады з умовамі, у якіх Мусаліні ў 1922 годзе ўзяў уладу ў Італіі, **«Тан»** піша, што становішча Гітлера значна меншэ карыстнае, бо сілы супраціўленьня фашызму ў Германіі невымоўна большыя, чым яны былі ў Італіі ў 1922 годзе. Гітлер зараз залежыць ад Гіндэнбурга і нацыяналістаў і таму ня мае такой свабоды дзеяньняў, якую меў у свой час Мусаліні.

У заключэньне «Тан» піша: «Падзеі, якія разгортваюцца па той бок Рэйну, могуць трагічна адбіцца на ўсёй міжнароднай абстаноўцы. Нельга адносіцца абыякава ні да перамогі гітлераўскай дыктатуры ў Бэрліне, ні да ўстанаўленьня ў Германіі непаладзку і анархіі».

Створан Беларускі дзяржаўны тэатр опэры і балету

У БССР створан дзяржаўны тэатр опэры і балету.

Паводле пастановы Наркамасьветы дзяржаўная студыя опэры і балету рэарганізавана ў беларускі дзяржаўны тэатр опэры і балету. Дырэктарам тэатру прызначаны тав. І. А. ГІТГАРЦ.

Урачыстае адкрыцьцё тэатру адбудзецца 1 мая ў будынку Дзяржаўнага Тэатру ў Менску пастаноўкай опэры «АПРЫЧНІКІ» («Царская нявеста»). Музыка Рымскага - Корсакава. Пастаноўшчык рэжысэр Вульф.

У другой палове мая пойдзе опэра «Карэн». Далей — у чэрвені опэра «ЯЎГЕНІ АНЕГІН» пастаноўшчык В. Барысэвіч. Пасьля «Анегіна» ў зусім пераапрацаваным відзе будзе пастаўлен «ЗАЛАТЫ ПЕЎНІК» у пераапрацоўцы маладога рэжысэра І. Балоціна. У ліпені балетны аддзел тэатру пакажа ў новай апрацоўцы балет «ЧЫРВОНЫ МАК». Пастаноўшчык — балетмэйстар тэатру Краснарэўскі.

Уся работа над указанымі пастаноўкамі вядзецца пад непасрэдным кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка — галоўнага дырыжэра тэатру тав. ГІТГАРЦА.

Выміраючыя гарады Германіі

«Дзеньнік віленскі» падае статыстыку сьмяротнасьці ў буйных германскіх гарадох са звыш 50 тыс. насельніцтва.

Аказваецца, што лік гарадоў, у якіх сьмяротнасьць значна перавышае нараджэньне, хутка ўзрастае. Гэтыя гарады немцы назвалі «выміраючымі гарадамі».

Калі ў 1930 г. Бэрлін быў адным горадам, дзе сьмяротнасьць перавышала нараджэньне, то ў 1931 г. далучыліся гарады: **Гамбург, Мюнхэн, Лейпцыг, Дрэздэн, Магдэбург, Альтон.** У 1932 г. далучаюцца новыя гарады — **Браўншвэйг, Вісбадэн, Плаўэн, Браслаў, Вюрцбюрг, Гэрлітц, Дарштадт, Гера, Лігніц, Франкфурт на Одры, Швэрын, Потсдам.**

Всэ гарады, у якіх трупаў больш, чым калысак.

Наступ-жа насельніцтва ў Германіі павялічваецца. Паводле апошняга перапісу ў 1930 г., лік насельніцтва складаў **62.089.000 чал.**, г. зн. на 2.678.000 больш, чым у папярэднім сэнсе ў 1925 г.

Лік нараджэньняў, аднак, з кожным годам значна зьмяншаецца. Ад 1840 г. да 1900 лік нараджэньня складаў **36** на 1.000 чал. кожны год. Ад 1900 г. да 1913, г. зн. да выбуху сьмярэлістычнай вайны, лік нараджэньняў зьменшыўся **да 26,8 на 1.000 чал.**; у 1930 г. панізіўся да **17,5**, у 1931 г. — **да 16** (пры апушчэньні насельніцтва на 305.000 душ), а ў 1932 г. — **толькі 14 нараджэньняў на 1.000 чалавек насельніцтва.**

ЗАПЫТАНЬНІ АБ ПАКЦЕ НЕНАПАДУ НА СЭСІІ ЯПОНСКАГА ПАРЛЯМАНТУ

ТОКІЁ. 4-га лютага, як паведамляе тэлеграфнае агенцтва Сімбун Рэнго, на бюджэтнай камісіі японскага парлямэнту прадстаўнік партыі мінсэйто Мацумота задаў пытаньне: **«Як адносіцца вае грамадзкая думка пытаньне аб заключэньні пакту паміж Японіяй і СССР?»**

Адказваючы на гэта пытаньне, міністар замежных спраў Уцыда заявіў: **«Ёсьць шмат розных поглядаў на савецка-японскі пакт. Я асабіста ўстрымліваюся ад выказваньня сваёй асабістай думкі».**

Мацумота зноў запытаў: «Мацумэка на сходзе Лігі нацый заявіў: **«Грамадзкая думка Японіі падтрымлівае заключэньне савецка-японскага пакту».** Я думаю, што заява ўрадавага дэлегата супадае з поглядамі міністэрства замежных спраў. Ці так гэта?»

Уцыда адказаў: «Што датычыць савецка-японскага пакту, дык Мацумэка ня быў упаўнаважан заяўляць аб гэтым. **Калі ён зрабіў падобную заяву, то выказаў толькі сваю асабістую думку».**

Пасьля заявы Уцыда, Мацумота зноў выст пў і сказаў: **«Што за недарэчнасьць! Урадавы дэлегат выступае з канкрэтнай заявай ў Лізе нацый, а міністар замежных спраў ліквідуе гэта выяўленьнем асабістай думкі. Адсюль можна заключыць, што няма адзінства думак паміж дэлегатам у Лізе нацый і ўрадам».**

Уцыда адказаў: «Дэлегат ніпраўдзіва паступіў, калі зрабіў заяву па пытаньні, якое ня ўваходзіць у яго кампэтэнцыю. Больш нічога я не магу сказаць».

Далей Мацумота просіць Уцыда выясьніць, як разумець тое месца з прамовы Уцыда ў парлямэнце 2 лютага, якое датычыла ўплыву апаўлення дыплёматычных адносін паміж Кітаем і СССР на рэвалюцыйны рух на Далёкім Усходзе?

Уцыда адказаў: «Мае словы азначаюць, што я яго хацеў запытаць пытаньні аб уплыве апаўлення дыплёматычных адносін паміж СССР і Кітаем на рэвалюцыйны рух на Далёкім Усходзе».

„Камісія 19“ адхіліла японскую прапанову

ЖЭНЭВА. 4-га лютага на закрытым пасяджэньні «камісіі 19-ці» абгаворваліся новыя японскія прапановы, якія зводзяцца да патрабаваньня выключыць з цэнзуры рэзалюцыі пункт аб непрызнаньні Манчжоў-Го і абумовіць найменшаньне будучага згаджальнага камітэту ў непасрэдныя перагаворы паміж бакамі.

У выпушчаным афіцыяльным камунікаце гаворыцца: «Пасьля тлыбокага разгляду гэтых прапаноў, камісія 19-ці, аддаючы належнае духу, у якім яны зроблены, прымушана была, на жаль, прыйсьці да высноў, што яны **настолькі істотна адрозьніваюцца ад ня ўласных прапаноў, сфармуляваных 16 сьнежня, нават ужо ў зьменшым адпаведна жаданьням японскага ўраду выглядзе, што из стварэньня здавальняючай базы для згаджальнай працэдуры на падставе пункту 3, артыкулу 15, статуту Лігі нацый, асабліва ў адносінах рэкамандацый камісіі Літона».**

«Камісія 19-ці» прапанавала генэральнаму сакратару паведаміць японскую делегацыю аб яе пункце гледжаньня, указаўшы, што адзіна магчымая база, якая мела-б разумныя шансы прывесьці да спрыяючага рэзультату, заключаецца **ў прыняцьці японскім урадам прапаноў ад 16 сьнежня з дзьвюма ўжо зробленымі зьменамі.**

На пасяджэньні камісіі быў таксама агалошан лист кітайскай делегацыі з патрабаваньнем **назначэньня канчатковага тэрміну прадстаўленьня дакладу.** Аднак, у камісіі не гаворыцца, ці быў дан адказ кітайскай делегацыі. Паводле вестак, **ніякага адказу дана ня было.**

Дэкаднік Беларускай Акадэміі Навук у Маскве

МАСКВА, 5. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта). Вялікая зала Камакадэміі абшчынута істужкамі чырвоных лёзунгаў: «Братэрскае прывітаньне делегатам Беларускай Акадэміі Навук — саратнікам на фарматычным фронце».

Стрымана гудзіць аўдыторыя. Тут і там на радох красуюць кучкамі сядзяць беларускія делегаты, акружаныя работнікамі маскоўскай Камакадэміі: філёсофы, гісторыкі, эканамісты, літаратуразнаўцы, геолёгі, матэматыкі. Кожны па сваёй галіне знаёмяцца з вопытам работы маскоўскіх таварышоў.

Раз-па-раз зала асьвятляе бляск магнія. Фота-рэпарцёры старанна працуюць для беларускіх делегатаў. Асабліва ажыўленьне ля тых. Матлы. Яны яго проста «замучылі», засьляпіўшы вочы бляскам магнія. Лёгкі, вясёлы гумар і жарты на хвілінку перарываюць гул сурёзных гутарак вучоных.

Тут, у гэтай залі адбылося адкрыцьцё дэкадніка. У той першы дзень, перад маскоўскімі таварышамі, прэзыдэнт Беларускай акадэміі тав. **Горын** разгарнуў панараму магутнага сацыялістычнага росту брацкай нацыянальнай рэспублікі. Ён параўнаў гэты рост з хілым Беларусі, жабрацкім мінулым паўкалёніі, падвойна прынечанай царскай Расіяй. Мапюючы контрэвалюцыйныя ўкрапленьні сацыялістычнай беларускай прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, тав. Горын напомніў таварышам другую Беларусь па Захадзе, у капіталістычнай Польшчы, дзе эканамічны і культурны заняпад, дзе адзіны рост беспрацоўя, нішчэньнасьці і... ваеннага ўзбраеньня.

Гэтыя лічбы параўнаньня росту «ў нас» і заняпаду «ў іх» паўсталі перад аўдыторыяй дзьвюма крывымі. На іх канве выразна вымалёўвалася адзінае: як сучасны крызіс капіталізму вострае ўдарыў па навуцы «ў іх» і як у нас перамога сацыялізму ўзьняла навуку на неасяжную, нябачаную вышыню.

— Толькі дыктатура пралетарыяту здольна ў шырокіх нацыянальных рэспубліках стварыць навуковыя ўстановы, якія маюць усесаюзнае значэньне. Такой установай зьяўляецца Беларуская Акадэмія Навук, якая пры дапамозе СССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, стала сапраўды цэнтрам навуковай мысьлі.

Але гэта не давалася без барацьбы.

Перад маскоўскімі таварышамі ў гэты вечар прамільгнулі зрэшкі малюпкі клясавай барацьбы на ідэалёгічным фронце.

У першы перыяд, калі скончылася грамадзянская вайна, «адрасаты Беларусі», скарыстоўваючы давер'е партыі і ўраду, памячалі даволі выразную праграму адрыву Беларусі ад Савецкага саюзу. Дакладчык выкліваў у памяці прысутных вядомую фігуру Ластоўскага, былога прэм'ер міністра, а потым «акадэміка», пад кіраўніцтвам якога контр-рэвалюцыйныя нацыёмы разам з вялікадзяржаўнымі шавіністамі і чорнасоценцамі ператварылі мовазнаўства, гісторыю, літаратуру, археалёгію, этнаграфію і інш. у вучастак барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту.

«Крыўска - беларускі слоўнік» са зьменай інтэрнацыянальных, агульнарэгіянальных слоў, створаных Кастрычніцкай рэвалюцыяй, штучна створаныя «самастойнымі» словамі. «Навукоссыя» «гістарычныя» доказы аб «крывічах», «фальклёрныя матар'ялы аб старадаўнасьціне», малітвы, складзеныя контр-рэвалюцыянэрамі, «беларускія 10 заповедзей», — усё гэта нацдэмаўская «прадукцыя», якою ілюстраваў свой даклад тав. Горын інтэрвэнцыяністскую палітыку «беларускіх адраджэнцаў» у памяці нам перыяд...

Дакладчык ажывіў у памяці ўжо даўно нам вядомыя старонкі дзейнасьці контр-рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму ў сьценах Акадэміі. Апошні разгромлен, але далёка недабіт. За апошнія часы мы ў сувязі з абвастраньнем клясавай барацьбы маем актывізацыю, ажыўленьне розных антысавецкіх элементаў, якія, прыкрываючыся фальшыва - нацыянальным сьцягам, зноў прабуюць пралезьці ў шчыліны таго ці іншага вучастку навукі. Пры гэтым у цяперашні перыяд выступленьні гэтых элементаў адзначаюцца надзвычай завуаляванай формай.

Узмацненьне дзейнасьці нацыянал-дэмакратаў у Беларусі акрылёў і ўскарміў вялікадзяржаўны шавінізм, які актывізаваўся асабліва за апошнія часы ў сувязі з абвастраньнем клясавай барацьбы ў краіне.

— Цяпер нашы форагі не выступаюць з цытатамі са Скарыны, з «крывіцкай гісторыі», а хаваюцца за цытатамі Леніна і Маркса.

Дакладчык прывёў прыклад з гісторыкам Гесэнам, які, спасылаючыся на скажоныя цытаты Леніна, хацеў навязаць рэвалюцыйнасьць кулаку, маляваў нацыянальны ўціск былой царскай калёніі — Беларусі, як уціск кулака, дэмакучы чаму аднішні ва ўмовах Беларусі і набыў рэвалюцыйныя якасьці.

Вылазкі падобных «вучоных», якія схавалі свае буржуазныя «тэорыі» пад фальшывым нацыянальным сьцягам, выкрыты. Яны атрымалі рашучы адпор з боку партыі, савецкай грамадзкасьці. Але паперадзе яшчэ шмат напружанага змаганьня.

— Цяпер перад намі, работнікамі навукі, — кажа тав. Горын, — задачы ўскладніліся асабліва. Навука — ключ, пры дапамозе якога мы ажыцьцявім другую пяцігодку. А гэта вылікае шалёнае супраціўленьне ворагаў пяцігодкі.

У першую чаргу наша ўвага павінна быць прыцягнута да якасьці нашай навуковай працукцыі, бо ў нашых умовах гэта пытаньне вялікага палітычнага значэньня.

У заключэньне тав. Горын асабліва падкрэсьліў неабходнасьць практычнай работы на плянаваньні навукі.

— Пытаньне плянаваньня — гэта на сутнасьці пытаньне аб кіраўніцтве пралетарскай навукай. Пастанова СНК БССР аб тым, што Беларуская Акадэмія Навук зьяўляецца вышэйшым цэнтрам, плянуючым і кантралюючым усю навукова-дасьледчую работу, далёка яшчэ не рэалізавана. Гэта задача стаіць зараз перад намі ва ўвесь рост.

Тав. **Пашуканіс**, які выступіў ад імя прэзыдыуму Усесаюзнай Камакадэміі, спыніўся на тых задачах і рабоце, якія павінны праводзіцца Акадэміяй Навук БССР, асабліва цяпер, калі сацыялістычнае будаўніцтва ставіць перад навуковай думкай цэлы рад новых праблем, якія ніколі не распрацоўваліся.

Ён асабліва падкрэсьліў неабходнасьць узмацненьня барацьбы работнікаў навукі з рознымі ўхіламі ў нацпытаньні, за выразнае праведзеньне генэральнай лініі партыі і ўзьніку навуковай работы з практычнай сацыялістычнага будаўніцтва ў другой пяцігодцы.

А. Сучкова.

Хроніка дэкадніка

У часе дэкадніка па маскоўскіх рабочых клюбах, заводах і навуковых установах акадэміі БССР прачытаюць рад дакладаў.

У клюбе дарпрафсаюзу МБВ з вялікім дакладам аб нацыянальна - культурным будаўніцтве БССР выступіць праф. **Панкевіч.**

У польскім, яўрэйскім, латыскім клюбах т. т. **Віткоўскім, Гершанбаўмам і Шкільтэрам** будуць прачытаны даклады аб нацкультбудаўніцтве сярод польскага, яўрэйскага, латыскага, працоўнага насельніцтва БССР.

Тав. Шкільтэр выступіць з дакладам аб Заходняй Беларусі на заводзе газ № 1 і ва ўнівэрсытэце нацменаў Захаду.

На электразаводзе адкрыецца паставіць даклад тав. **Каўцэвіч** «аб энэргетычных рэсурсах БССР». У інстытуце бульбы тав. **Ганчарык** прачытае лекцыю на тэму «Уплыў [illegible] гатовасьці глебы на разьвіцьцё бульбы».

У часе дэкадніка ў адным з пакояў Камакадэміі адкрыта выстаўка кніжнай прадукцыі Акадэміі Навук БССР і Усесаюзнай Камакадэміі.

Делегаты арганізавалі экскурсію па фабрыку-кухню, якая абсталявана на апошнім слове тэхнікі і абслугоўвае кожны дзень 40 тыс. абедаў высокай якасьці.

А. С.

ПАСЯДЖЭНЬНЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ФРАКЦЫІ ЦВК БССР

адбудзецца 8 лютага а 5 гадзіне ўвечары

ў залі Цэнтральнага Дому Селяніна (былы клюб імя Карла Маркса).

Бюро фракцыі КП(б)Б прэзыдыуму ЦВК БССР.

Паведамленьне

Сакратары парт'ячэек і загадчыкі аддзелаў кадраў пералічаны наркаматаў, аб'яднаньняў і трэстаў павінны зьявіцца ў ЦКК-НК РСІ Беларусі 10 лютага 1933 году, у 6 гадз. вечара ў пакоі № 12: Наркамшляхоў; Наркамаховы здароўя; НКСаўгасаў, НКАсьветы; НКСапрабесьпячэньня; НККамгаспадаркі; НКФіну, НКЗему, НКЛесу; НКЦяжпраму; НКПадлю; НКОпабу; НКЛёгпраму; Белгандлю; Белмодагарадніны; Белзагатжывёлы; Белкалгасаюзу, Белторфу, Матэраляб'яднаньня; Белкіраўніцтва сувязі; ЦК Чырвонага крыжу; Белкаапрамсавету; Лесбелу; Абутковага трэсту; Палграфаб'яднаньня; Белшвейтрэсту; Белкультрэсту; Белдзяржкіно; Тэкстыльаб'яднаньня; Галоўдортрансу; Трактарацэнтру.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)
СЕНЬНЯ
А. Міровіч
ЛЁН п'еса ў 3-х дзеях
Пастаноўка заслуж. арт. рэсп. А. А. Міровіча і М. А. Зорава.
Пачатак у 8 гадзін вечара.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА Каса—ад 1 г. дня.
Амэрыканская карціна ДАЛІНА АГНІСТЫХ СКАЛ Гукавая хроніка СЛЮЗКІНО

Кіно ПРАЛЕТАРЫ
НЭГР з Шырыдану
Дзенныя дзіцячыя сэансы ГОРОД пад ВАДОЙ

Кіно СПАРТАК
Ад 7 лютага мастацкі фільм (праца карціны „ПУРГА“) НОРД-ОСТ Драма ў 6 ч.
Штодзенна 5 сэансаў. Каса—ад 1 г. дня.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА
Усіх загадчыкаў клюбаў, домоў сац. культуры, нардомоў, школ, рабфакоў саўгасаў, старшынь праўленьняў калгасаў, вайсковых арганізацый, што знаходзяцца на тэрыторыі Менскага, Заслаўскага, Дзяржынскага, Узьдзенскага, Лагойскага, Плешчаніцкага, Бягомольскага, Смалявіцкага, Барысаўскага, Бярэзінскага, Талочынскага, Крупскага, Чэрвеньскага і Пухавіцкага раёнаў, якія маюць свае уласныя кіно-установы, як стацыянарнага тыпу, так і кіно-перасоўкі, што
Мендзяжкіно
прыступіла да
ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ ДАГАВАРОЎ
НА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ ІХ КІНО - ФІЛЬМАМІ
НА 1933 г.
Заключэньне дагавораў прапагавецца да 15-II—1933 г.
Арганізацыі, якія маюць свае кіно-установы і не заключаць умовы да 15-II—33 г., на будуць забесьпечаваць плянавае кіно-фільмамі.
Прысылаць сваіх прадстаўнікоў для заключэньня ўмоў ці сваіх пісьмовых згод аб заключэньні ўмоў трэба ці на адрас: Менск, Савецкая, 90, Мендзяржкіно.
МЕНДЗЯРЖКІНО.

КШЭ

Да увагі насельніцтва гор. Менску
Арцель „Чырвоны абутнік“
ПРЫМАЕ ў РАМОНТ
рознага роду
абутку са ўсіх аддз. гораду без чаргі
і без абмежаваньня, за выключэньнем тых майстэрань, якія знаходзяцца на заводах і фабрыках.

За дапушчаную пратэрміноўку пазычкі торфарцельню „Залужэньне“ у суме 1775 руб.
Полацкае аддзяленьне Дзяржбанку
ПРАДАЕ ТОРФ
у колькасьці 224 тоны,
які знаходзіцца на балоце торфарцелі ў Вусайскім сельсавеце, Вушацкага раёну (30 клм. ад ст. Лоўша).
Арганізацыі, жадаючыя купіць торф, павінны паведаміць банк.
Полацкае аддзяленьне Дзяржбанку.

АДКРЫТЫ СКУПАЧНЫЯ ПУНКТЫ
срэбра і золата ў абмен на таварныя ордэры „ТОРГСІНА“
Пункты па скупцы:
1. Універмаг Торгсіну—Ленінская 19.
2. Аддзяленьне „Мосторгу“—Ленінская 24.
3. ЗРК Мэтал.—рог камсамольскай і Савецкай.
4. Пляц Волі і рог Школьнай.
5. Пляц Парыскай Камуны —ЦРК № 13.
Есьць вялікі выбар тавара-прадуктаў ПА ПАНІЖАНЫХ ЦЭНАХ
ТОРГСІН.

ТОРГСІН
З 5-га лютага г. г.
апрача існуючых скупачных пунктаў
АДКРЫЎ
ЦЭНТРАЛЬНЫ СКУПАЧНЫ ПУНКТ
па прыёмцы золата, срэбра лом і старой чаканкі
па КАМСАМОЛЬСКАЙ вуліцы д. № 15. (побач з канторай).
Бел. кантора „ТОРГСІН“.

Згодна пастановы прэзыдыуму Бярэзінскага РВК,
Бярэзінскі райпрамкамбінат ЛІКВІДУЕЦЦА.
Усе прэтэнзіі да былога райпрамкамбінату павінны быць прад'яўлены ліквідкому пры РВК да 10-II—33 г.
Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.
ЛІКВІДКОМ.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“
Ад 7-го лютага
мастацкі фільм вытворчасьці Ўкраінфільм
КАЛАМУТА (ЗУСІМ НОВЫ ЭКЗЭМПЛЯР).
Рэжысэр—ТАСІН.
У галоўных ролях:
І. ПАНАЎ, Г. ЗАСІМАЎ, Н. ТОРСКІ, Л. ЗАПАДНАЯ, Г. ГАНЧАРАЎ.
Звыш праграмы кіно-хроніка Сяювіно. Каса адкрыта штодзенна ад 12 г. дня.

6 лютага 1933 г.
ВЫШАЎ з ДОМУ
10-ці гадовы хлопчык Зэма Бернштэйн, у бобрыковым паліто, у вялікіх мужскіх чаравіках і серай цёплай шапцы.
Паведаміць друкарню „Зьвязды“ тэл. № 6-42, аўт. № 21-357

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА
Усіх прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый, што бягучы рахунак № 100470 Цэнтральнага савету т-ва вынаходцаў у Маскве— у агенцтве Дзяржбанку пры Палацы Працы
з 1-га лютага закрыт,
а з таго ж часу
АДКРЫТ
разьліковы рахунак № 11036
у Маскоўскай абласной канторы Дзяржбанку, куды і патрэбна будзе накіроўваць усе сумы адліку ад фонду садзейнасьці вынаходзтву і рацыяналізацыі, згодна пастановы СНК СССР ад 8-VIII—31 г.
Ц. О. т-ва вынаходцаў СССР.

Каўбасная фабрыка
Менскага мясакамбінату
ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ
на выпрацоўку каўбасных і вяндлінных вырабаў.
ад усіх арганізацый, ЗРК і інш. аб'яднаньняў.
Для заказаў і заключэньня ўмоў зварачацца: Менскі Мясакамбінат, Чэрвеньскі тракт № 3, тэлефон 13-96.
ДЫРЭКЦЫЯ.

РАБФАК
ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНАГА ІНСТЫТУТУ
абвяшчае НАБОР студэнтаў на II II курс вячэрняга рабфаку без адрыву ад вытворчасьці.
Інтэрнатам і стыпэндыяй студэнты не забясьпечваюцца.
Заявы з анкетамі і дакумэнтамі да 20 лютага прымаюцца ў канцылярыі рабфаку: Менск, Новаканстыцкая, 76, 2-й паверх.
Іспыты адбудуцца 21-II у 6 гадз. вечара.
ДЫРЭКЦЫЯ РАБФАКУ.

БЕЛДЗЯРЖКІНО
ПАТРЭБНА
НА СТАЛУЮ ПРАЦУ
мацыяністка
Зварачацца: Менск, Савецкая 90 другі паверх.

Друкарні газэты „ЗЬВЯЗДА“ ПАТРЭБЕН на сталую працу
БУХГАЛЬТАР
са стажам вытворчай бухгальтэрыі
Зварачацца: Савецкая, 63, 2-гі паверх, кантора друкарні.

Менск, друкарня «Зьвязды»
Галоўлітбел № 337